Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 47 (2741) Год LIII | Беласток, 23 лістапада 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Віцебск, Віцебск

фота Міры Лукшы

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Хто не быў, няхай шкадуе. Але шмат з тых, хто ў мінулы ўік-энд не трапіў у беластоцкі Драмтэатр імя Аляксандра Вянгеркі, можа мець жаль да дырэкцыі тэатра; вось рэклама трох прэзентаваных спектакляў аднаго з найлепшых еўрапейскіх тэатраў — віцебскага Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа была жалюгодная, нават мясцовыя газеты не паквапіліся, каб паведаміць аб яго выступленнях.

Тэатр з Віцебска афіцыйна гасцяваў у Беластоку першы раз. Акцёры гэтага тэатра шэсць гадоў таму паказвалі ў Крынках, Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы „Арышт", драму Сакрата Яновіча, дагэтуль неперакладзеную на польскую мову, п'есу аб Францішку Аляхновічу і Браніславе Тарашкевічу. У гэты раз у сталіцы Падляшскага ваяводства прадставілі тры спектаклі: „За двума зайцамі" ўкраінскага драматурга Міхала Старыцкага, „Псіхааналітык для псіхааналітыка" ледзь трыццацігадовай Дзіяны Балыкі, журналісткі і драматурга, якая жыве ў Беларусі, а родам з ваколіц Мурманска, ды „Шагал... Шагал..." Уладзіміра Драздова, спектакль, які здабыў першую ўзнагароду 2000 г. на адным з найбольш прэстыжных фестываляў у свеце, у Эдынбургу. Несумненна, кожны з гэтых спектакляў быў мастацкай падзеяй, хоць усе яны былі пастаўлены ў іншай эстэтычнай катэгорыі — ад касцюмнай камедыі ў стылістыцы вадэвіля („За двума зайцамі"), лірычна-эратычнай камедыі („Псіхааналітык...") да поўнага настрою аповеду аб тузе за радзімай („Шагал..."). На жаль, першыя два спектаклі паглядзела вузкае кола „паінфармаваных". Калектыў Вянгеркі быў у гэты час на гастролях у Вроцлавае, а шмат тутэйшых беларусаў, звязаных з мастацкім асяроддзем, прабывала тады на аглядзе Беласток — Гродна.

У размове з „Нівай" дырэктар віцебскага тэатра Рыгор Шацько сказаў:

— Я ведаю, што беластоцкі тэатр супрацоўнічаў з тэатрам з Гродна, ды маю надзею, што і наша супрацоўніцтва будзе развівацца. Тым больш, што польскі пасол і консульства вельмі добра аднесліся да нашага прыезду ў Беласток, хоць бы шляхам выдачы нам бясплатных віз. Выбар спектакляў, з сарака якія маем у нашым рэпертуары, зрабіла дырэкцыя беластоцкага тэатра. Наш тэатр працуе выключна па-беларуску. Прывезлі мы такія п'есы, якія, думаем, будуць падабацца і крытыкам, звычайным гледачам, хоць не з'яўляюцца нашымі мерапрыемствамі зрэалізаванымі з вялікім сцэнічным размахам. Мы хацелі паказаць тое, што ў меру лёгка перавезці.

Дырэктар Шацько паінфармаваў, што неўзабаве віцебскі тэатр атрымае прэзідэнцкую ўзгнагароду за папулярызацыю беларускага мастацтва за мяжой.

— Цяпер Віцебск з'яўляецца культурнай сталіцай Беларусі. Праводзіцца ў нас мноства фестываляў, з папулярным таксама ў Польшчы „Славянскім базарам".

Тэатр імя Я. Коласа вядомы амаль ва ўсім свеце. Апошні часам выступаў на падмостках культавага ўжо маскоўскага Тэатра на Таганцы, у Лондане і ў Нью-Йорку. Якраз у свеце агромнай папулярнасцю карыстаецца „Шагал... Шагал...", рэжысёрам якога з'яўляецца галоўны рэжысёр таэтра Віталь Баркоўскі.

— З таго часу, калі Віталь Баркоўскі стаў галоўным рэжысёрам нашага тэатра, тэатр крыху адвярнуўся ад акадэмізму ў больш сучасны бок, — расказвае дырэктар Шацько.

Сам Віталь Баркоўскі прызнаўся „Ніве", расказваючы пра „Шагала..." (гэты эміграцыйны мастак быў родам з Віцебска):

— Найбольш цікавай для мяне была тая пачуццёвасць, з якой турбаваўся ён за лёс Беларусі, за яе творчае жыццё. Не вярнуўся ў Беларусь, але баяўся, што пасля таго што там убачыць, а што зрабілі савецкія ўлады, будзе замоцна балець яму душа. Шагал падказвае, як не загубіць уласную душу, беларускую душу.

Мы спыталіся ў рэжысёра ці лёгка сёння быць тэатральным артыстам.

Віталь Баркоўскі адказаў:

— Цяжка быць мастаком, калі чалавек не ўсведамляе адбываючыхся грамадскіх працэсаў, а кіруецца выключна цяперашнім. Мне здаецца, што кожны мастак павінен быць таксама і дыпламатам, павінен умець таксама размаўляць з чыноўнікамі, з уладай, умець весці дыялог. Вечнае крыўдаванне мала дае мастаку. Калі ідзе дождж, кожны ж стараецца мець з сабою парасон.

Дадаў прытым:

— Мастаку нельга запляміць Божы пацалунак. Трэба быць у першую чаргу бацькам, братам і сынам свае зямлі.

Віцебскі тэатр карыстаецца вялікім прызнаннем. Узнік ён у 1926 годзе на базе беларускай драматычнай студыі, якая існавала пры славутым Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры (МХАТ). Сярод тых, хто пісаў для тэатра, былі Якуб Колас і Янка Купала.

Беларускае асяроддзе ў Польшчы ацаніла мастацкае майстэрства калектыву тэатра, уручаючы пасля шагалаўскага прадстаўлення бел-чырвона-белыя букеты кветак.

Тэатр імя А. Вянгеркі будзе гасцяваць у Віцебску на пераломе лютага і сакавіка 2009 года.

9 770546 196000

БАТЭ і БТ

У беларускай спартовай прэсе скандал. Гучыць гэта надзвычай нязвыкла. У беларускай прэсе, ды нейкі там скандал!? Як могуць быць у нас праблемы з прэсай!? І як такое прапусціла цэнзура?! І хоць спорт не палітыка, то ўсё адно, калі там бачыш скандальны матэрыял, міжволі закрадваецца думка, што артыкул усё ж выйшаў з чыйгосьці дазволу.

А ўвесь той гвалт атрымаўся з нібыта адсутнасці належнага ўзроўню патрыятызму ў барысаўскіх аматараў футбола. У вельмі важным матчы БАТЭ (Барысаў) — „Зеніт" (Санкт-Пецярбург) беларускі футбольны клуб прайграў свайму расійскаму канкурэнту па Лізе чэмпіёнаў з лікам 0:2. Роспачы і расчаравання хапіла ўсім, бо нашы сапраўды добра гулялі і мелі шанцы. Ды вось для рэалізацыі сваіх намераў не хапала нейкай дробязі.

Вось на гэтай нібыта дробязі і разгарэўся цэлы медыйны скандал. Той-сёй са спартовых журналістаў прыйшоў да высновы, што нашым аматарам футбола са слаўнага горада Барысава не хапіла ні больш, ні менш, а толькі патрыятызму. Адным словам, забракавала патрыятызму беларусаў, бо нашаму клубу БАТЭ нічога не дало, што яны гулялі на сваім полі. Лепш бы другі раз матч адбыўся на чужым. Тады б нашы футбалісты ведалі чаго чакаць ад чужога гледача. А тут, у родным горадзе, майстры мячыка разлічвалі больш за ўсё на падтрымку свайго стадыёна. І рабілі ўсё, каб квіткі на матч прадаваліся менавіта ў барысаўскіх касах.

Ды вось атрымалася ўсё не так, як задумвалася. Барысаўскія хлопцы і дзяўчаты квіткі набылі. Але некаторыя толькі для таго, каб пасля іх перапрадаць фанатам „Зеніта". І нават у тых сектарах, дзе павінны былі сядзець барысаўскія, сядзелі піцерскія і падтрымлівалі свой клуб кожны ў тры гарлякі.

Вось і ўспомніла спартовая прэса пра беларускі патрыятызм, якога на полі бракавала, і пасыпала попелам галовы нацыянальна несвядомых барысаўцаў. Аднаго толькі, як заўсёды, забылася зрабіць, а менавіта, правесці журналісцкае расследаванне чаму так сталася. І куды той патрыятызм мог дзецца. Ці лепш даведацца, скуль ён мог узяцца.

Ды і пачаць не пашкодзіла б з сябе любімых, успомніць, на якой мове друкуюць свае матэрыялы самі беларускія журналісты. А на якой мове каментуюць матчы спартовыя каментатары? У большасці — зусім не па-беларуску. А робяць гэта на той мове, на якой размаўляюць фанаты ўсё таго ж расейскага „Зеніта". Хіба што ёсць праблемы з патрыятызмам і ў тых журналістаў, якія наракаюць на брак гэтага высакароднага пачуцця ў футбольных фанатаў. Напэўна яны спадзяюцца, што заўважаць у іх такі нігілізм, ды на першы беларускі нацыянальны канал Беларускага тэлебачання працаваць возьмуць. Вось і стараюцца па-руску гаварыць лепш, чым рускія. Родную мову прадалі за цёплае месца і някепскі заробак. Гэтак жа, як і барысаўскія прадалі свае квіткі зенітаўцам, бо лічаць, што няма дурных, і, як і тыя журналісты, таксама падзарабіць не супраць. Толькі хто большую здраду ўчыніў — разумныя, адукаваныя і эрудзіраваныя журналісты, з вельмі шырокім па іх прафесійным абавязку спектрам інфармаванасці, ці звычайны рабочы ААТ „БАТЭ", які можа з таго Барысава ні разу і не выязджаў нікуды, і не чуў на свае вушы, што на стадыёнах усіх іншых краін свету размаўляюць не па-руску, а па-свойму?

Неяк не чуваць у голасе нашых журналістаў патрыятызму і тады, калі ўлады і міліцыя забараняюць прыходзіць на стадыёны патрыётам з нацыянальнай бел-чырвона-белай сімволікай. Хоць добра ведаюць — гэтыя хлопцы і дзяўчаты, якія пад бел-чырвона-белымі сцягамі, свае квіткі не прададуць чужакам.

Дык скуль жа, „господа" спартовыя журналісты, той патрыятызм возьмецца ў аматараў футбола, калі яго ў вас, на каго тая спартова-патрыятычная місія ўскосна, а мо і на прамую ўскладваецца, няма ў саміх. Няма чаго, як кажуць, наракаць на люстэрка, калі морда крывая. Рыба, як вядома, гніе з галавы.

Так што, усім спартовых перамог і сапраўднага патрыятызму! І фанатам БАТЭ і журналістам БТ. І ўсім астатнім. А квіткі на футбольныя матчы перастануць перапрадаваць чужакам адразу, як матч каментаваць пачнуць па-нашаму. Калі не верыце, то праверце.

Віктар САЗОНАЎ

Не будзе цуду...

Урадавая кааліцыя прад'явіла парламенту праект закону аб службе аховы здароўя. Да прапановы адмоўна ставяцца апазіцыя і прэзідэнт. Гэты загадзя прад'явіў вета, аргументуючы, што камерцыялізацыя дзяржаўных шпіталяў гэта не што іншае як прыватызацыя. „У рынкавай эканоміцы здароўе не можа быць формай аўкцыёну дзеля здабывання прыбытку для шпіталяў", — гавораць левыя дэмакраты... А што на гэта пацыенты?

Калі ў ліпені я паспрабаваў прапісацца да ўролага ў Гайнаўцы, у рэгістрацыі заявілі, што бліжэйшы вольны тэрмін — люты 2009 года. Адміністратарка аднак намякнула, што лекар можа прыняць па-за чаргою. „Па чацвяргах уролаг прымае ад паловы пятай пасля абеду", — паясніла. Рызыкнуў я паехаць 31 ліпеня. Пашанцавала. Доктар агледзеў, прыпісаў лякарства ды суцешыў, што прыкметы хваробы нязначныя. Далей шае лячэнне паставіў у залежнасць ад аналізу крыві і ўльтрагукавога абследавання (УГА). Каб зрабіць УГА жывотнай поласці, трэба прапісацца ў рэгістрацыі. Паколькі я меў накіраванне ў беластоцкую паліклініку, таму лічыў, што там зраблю УГА па накіраванні ўролага. Але ў шпітальнай канцылярыі адправілі мяне з нічым. Сказалі, што прасвечвацца трэба ў Гайнаўцы. Пазваніў я ў рэгістрацыю, калі са шпіталя вярнуўся. Было гэта 15 кастрычніка. Тэрмін агляду назначылі мне праз два дні, на адзінаццатую гадзіну.

— А нельга раней? — пытаю. — Я прыезджы, пасля аперацыі...

— Дзякуйце Богу, што на апошняе месца „прыхваціліся", — адказаў мне голас у трубцы.

У дзень агляду на калідоры сабраўся шматлікі натоўп. Доктар пачала прымаць а палове адзінаццатай. Перш-наперш УГА рабіла хворым са шпітальных аддзяленняў, затым пацыентам па накіраванні. Такі шпітальны парадак. Пачалася калатнеча сярод чакаючых. У адрас медыкаў пасыпаліся эпітэты ды шматлікія заўвагі. Тут адна дамачка паспрабавала праціснуцца з боку да пані доктар „у прыватнай справе", але людзі не прапусцілі яе.

— Навошта вызначаюць гадзіну, калі назначанага часу не прытрымліваюцца, — загаварыла жанчына пры ўваходных дзвярах. — Я была першай на спіску, а перада мною каля дзесятка чалавек зайшло.

— Трыццаць шэсць год перапрацавала я на дзяржаўнай пасадзе. Васемнаццаты год ужо на пенсіі і ні разу не была ў шпіталі, — гаварывала прысівелая бабулька. — Дзе падзеліся грошы, якія трыццаць шэсць гадоў адводзіліся з маёй зарплаты? Каб была прыватная апека, прымалі б мяне з адкрытымі рукамі. А ў гэтых ніякай пашаны для чалавека няма. Для іх адно грошы давай...

У чарзе я затраціў каля дзьвюх гадзін, але задаволены быў, што з паняй доктар талкова пагаварыў (аказалася яна вопытным спецыялістам і сімпатычным чалавекам).

— Вынік прасвечвання будзе дасланы ўролагу, які даваў накіраванне, — паясніла лекарка пры развітанні.

Але да гэтага спецыяліста можна прапісацца... на вясну наступнага года. А мне ж неабходныя лякарствы. Хвароба не жартуе...

Кашмарам публічнай службы здароўя з'яўляюцца чэргі. Прычына ўсім добравядомая — не хапае спецыялістаў, якія выязджаюць за мяжу па большыя заробкі. Медыкі тлумачаць, што Нацыянальны фонд здароўя прапануе надта нізкія стаўкі за паслугі. І нічога не зменіцца ў бліжэйшым часе.

Нядаўна я правёў размову з гайнаўскім старостам Уладзімірам Пятрочукам на тэму працы Самастойнага публічнага прадпрыемства медычнай службы. І вось што пачуў я ў адказ.

— Ацэнкай службы аховы здароўя староства займаецца штогод у час вырашання фінансавых спраў, як і на пасяджэннях Рады павета. Сёлета, напрыклад, займаліся мы гэтым пытаннем на сесіі 28 жніўня. Радныя станоўча ацанілі працу публічнай медычнай службы. Шпіталь адпаведна рэалізуе задачы, мадэрнізуе прадпрыемства. Не мае задоўжанасці.

— А што з чэргамі да спецыялістаў?

— На гэта няма рэцэпту, — паясняе староста. — Не ад нас гэта залежыць. Асноўная справа ў грошах, колькі шпіталь іх атрымае ад Нацыянальнага фонду здароўя.

— Як бачыце ўрадавы праект рэформы службы здароўя? Што затым зменіцца на Гайнаўшчыне?

— Аб тым не думаем. Парламент не прыняў яшчэ закону. Калі шпіталі стануць працаваць на аснове суполак гандлёвага права, тады будзем разважаць над далейшай дзейнасцю публічнай службы здароўя. Бальніца пакуль працуе паспяхова. Калі з'явяцца фінансавыя праблемы, тады і задумаемся, як іх вырашыць, — сказаў староста Уладзімір Пятрочук.

Уладзімір СІДАРУК

Вачыма еўрапейца

Два інтэрв'ю

З увагай прачытаў я ў апошнія дні інтэрв'ю з міністрам замежных спраў Радаславам Сікорскім, якое паказалася ў адной з найбольш папулярных агульнапольскіх газет. Маё зацікаўленне было тым большае, што пытанні, пастаўленыя журналістам тае газеты наконт Беларусі і адносін з гэтай краінай Польшчы і ўсяго Еўрасаюза, я хацеў быў не так даўно сам паставіць пану міністру (не ўдалося мне, аб чым я некалькі тыдняў таму пісаў у „Ніве"). Журналіст пытаўся:

— Перад Усходнім партнёрствам стаіць вялікі пытальнік — Беларусь, якой кіруе прэзідэнт Лукашэнка, які фальсіфікуе выбары і тыраніць апазіцыю. Як прамаваць у ЕС стасункі з такім цяжкім партнёрам?

Міністр Сікорскі адказаў:

— Тое, што размаўляюць з сабой кіраўнікі памежных, мытных службаў, службаў бяспекі палётаў, консульскіх службаў, міністры эканомікі, чаго не было гадамі, гэта нейкі мінімум-мініморум у зносінах з суседам, што б мы не думалі аб яго ўрадавай сістэме.

Пасля шэф польскай дыпламатыі адзначыў:

— Я ведаю, што буду асабіста абвінавачаны ў кожным вяртанні да горшых паводзін у Беларусі. Я аднак не дараваў бы сабе, калі б не спрабаваў пакарыстацца шанцам, якім з'яўляецца спроба наладзіць дыялог з боку Беларусі.

— Часам працяглыя вынікі даюцца шляхам цвёрдасці, а часам зусім наадварот. Напрыклад, я мяркую, што паніжэнне цаны польскіх віз для беларусаў гэта не мяккасць або жэст у бок дыктатуры. Думаю таксама, што заключэнне дамовы аб малым памежным руху будзе карысным для нашых грамадстваў.

Тут аднак пан міністр пазбег адназначнага адказу калі тая дамова будзе заключана і, далей, калі яна ўступіць у сілу. Заявіў толькі адно: „Яна ўжо амаль гатовая".

Падобна, дарэчы, не адказаў, што з задумай паніжыць цану шэнгенскіх віз для беларусаў з 60 на 35 еўра, засланяючыся ў гэтых адносінах патрабаваннямі ЕС:

— Мы хадайнічаем і за гэта, але з-за відавочных прычын гэта залежыць не толькі ад нас.

Інтэрв'ю з міністрам Сікорскім паказалася амаль паралельна з размовай з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, якая паказалася ў „The Wall Street Journal". Беларускі кіраўнік падкрэсліў у ёй, што партнёрства Мінска з Вашынгтонам павінна „асноўвацца на роўнасці". Несумненна, Лукашэнка мае на думцы абмежаванне, а найлепш адмяненне абвостраных у лютым эканамічных санкцый, накладзеных амерыканскай адміністрацыяй на беларускія прадпрыемствы. Пры нагодзе Аляксандр Лукашэнка разлічвае на тое, што стасункі Злучаных Штатаў і Беларусі палепшацца пасля таго, як прэзідэнцкае крэсла зойме Барак Абама. Ці новы амерыканскі гаспадар, а затым новая амерыканская адміністрацыя маюць уяву „з чым есці" гэтую Беларусь, што гэта за тварэнне, дзе распаложана і г.д. Раней усё ж краіны ЕС, далей распаложаныя ад Беларусі, чым Польшча ці Літва, мусілі прайсці доўгую дарогу ва ўсведамленні таго, што існуе такая краіна. Дарэчы, вялікую працу ўклалі ў гэта менавіта Літва і Польшча. Мабыць, падобную ролю цяпер, для прыкладу, міністр Сікорскі можа адыграць у адносінах да палітычна блізкага ягонай групоўцы (ГП) Белага дома дэмакратаў, пераконваючы амерыканцаў — так як сцвердзіў у прыгаданым інтэрв'ю — пакарыстацца шанцам, якім з'яўляецца спроба Беларусі наладзіць дыялог. Да таго можна прывесці думку, якую выказаў яшчэ на пачатку кастрычніка кіраўнік МЗС Фінляндыі Аляксандр Стуб, цяпер старшыня АБСЕ:

— Прыйшоў час, каб адвярнуць карту ў беларуска-еўрапейскіх стасунках.

Ці ўжо час, каб адвярнуць карту і ў стасунках амерыканска-беларускіх?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Ці з'ядуць нас дзікі?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Дзікі за кароткі час знішчылі два гектары кукурузы на полі Валянціна Васілюка побач пасёлка Звадзецкае

Невыпадкова лугі і аблагі, на якіх раней раслі збожжа або бульба, распаложаныя непадалёк ад Белавежскай пушчы або на пушчанскіх палянах, зараз зарастаюць кустамі і дрэўцамі. У прыпушчанскіх вёсках людзі наракаюць на лясную звярыну, а асабліва на дзікоў, якія нішчаць збожжа, бульбу і агародніну, а кампенсацыі за знішчаныя палеткі, якія выплачваюцца гаспадарам згодна з законамі, не вяртаюць таго прыбытку, які яны мелі б ад ураджаю. Нядаўна жыхары Навасадаў і Звадзецкага паінфармавалі пра вялікія знішчэнні на іх палях, дзе дзікі вымалацілі збожжа, з'елі бульбу і нават агародніну. Дадаткова паявіліся чуткі, што эколагі прапануюць спыніць паляванні ў пушчы.

У прыпушчанскіх вёсках наракаюць на дзікоў

Сяляне з Пагарэльцаў, Войнаўкі ці аднаго з арэшкаўскіх хутароў з роспачу расказвалі, як выбіваліся з сіл, стараючыся днём і ноччу ахоўваць свае палеткі, асабліва з бульбай, якую дзікі патрапілі пераараць нават за некалькі начэй. Гаспадары, апрача начных дзяжурстваў па сваіх палях (некаторыя нават летам начавалі на змену побач свайго збожжа), карысталіся дапамогай сабак і палілі вогнішчы. Аднак зараз забаронена распальваць вогнішчы на палях, асабліва побач пушчы. З часам дзікі настолькі прывыклі да людзей, што нават грукатам аб металічныя прадметы, ці страляннем з пістонаў цяжка іх прагнаць. Раней Белавежская пушча ў многіх месцах была адгароджаная ад людскіх сяліб драўлянымі платамі, якія рамантаваліся, а калі ўжо лясная звярына прарывалася праз засекі, дык разыходзілася па ўсіх палях і шкоды, якія ўчыняла для паасобных гаспадароў, былі невялікімі. Зараз, калі ў прыпушчанскіх вёсках гаспадараць толькі адзінкі, звярына ў пошуках збожжа або бульбы трапляе якраз да гэтых самых гаспадароў і з'ядае ім збожжа або бульбу. Некаторыя сяляне невялікія кавалкі поля, прызначаныя для агародніны, сталі абгароджваць драўлянымі жэрдкамі, а нават абводзіць калючым дротам. Жанчына з Пагарэльцаў расказвала нават, што вымушана была зрабіць клетку, абцягнутую драцяной сеткай, дзе гадуе некалькі курак, каб усцерагчы іх ад лісоў. Нават тыя гаспадары, што з-за старэйшага ўзросту або безвыніковага змагання з дзікамі, рашыліся не пакідаць сваіх палёў аблагамі і абсадзілі зямлю саджанцамі, мусяць пільнаваць малады лес, бо невялічкія дрэўцы гэта ўлюбёны прысмак лясной звярыны, якая з'ядае вяршняк, пасля чаго дрэўцы засыхаюць.

— Адзін зубр за ноч можа з'есці вяршняк саджанцаў нават на паверхні 1 гектара, — удакладняе Валянцін Васілюк са Звадзецкага, у якога вялікія знішчэнні зрабілі якраз дзікі.

Дзікі прыйшлі пад Навасады, Звадзецкае і Скрыплева

У гэтым годзе жыхары Навасадаў і суседніх пасёлкаў — Звадзецкага і Скрыплева адчулі пазалясную дзейнасць дзікоў асабліва моцна на сваёй шкуры, а ўдакладняючы, на сваіх палях, абсеяных збожжам, бульбай і агароднінай. Валянцін Васілюк са Звадзецкага вязе мяне на палетак кукурузы.

— За 4 дні дзікі з'елі палову кукурузы, а пасля за 2 тыдні перамалацілі ўсю апошнюю кукурузу на 2 гектарах. Я падлічыў, што выдаткаваў чатыры тысячы пяцьсот злотых, а выплацілі мне толькі тысячу шэсцьсот злотых кампенсацыі. Справа тут не ў грошах, бо паводле абавязваючых законаў больш і не могуць выплаціць. Трэба задумацца, што рабіць, каб лясная жывёла не нішчыла пасяўной плошчы, а да гэтага ў нейкай ступені спрычыняюцца кармушкі для звярыны на акраінах пушчы. Калі лясная звярына збіраецца каля кармушак побач Кабыляй Шыі, уздоўж Нараўкі — побач Грушак і Гушчэвіны, непадалёк ад Крыніцы і ў іншых месцах на акраіне пушчы, пасля выходзіць па-за лес і нішчыць збожжа, — расказвае Валянцін Васілюк.

Зараз паміж Навасадамі, Звадзецкім і пушчай большасць палёў займаюць аблагі і лесанасаджэнні. Людзям не хапала сіл, каб змагацца з лясной звярынай. Але некаторыя гаспадары сеюць збожжа па сённяшні дзень, якое ў вялікай ступені знішчаецца жыхарамі лесу.

— Дзікі знішчылі мне паўгектара збожжа. Так яго прарылі, што не трэба было малаціць яго, а далі толькі 200 злотых кампенсацыі. У некаторых людзей дзікі і агародніну паз'ядалі. Прывязваем мы сабак на полі, ставім пудзілы, але мала гэта дапамагае, — распачае Зіна Боўтрык з Навасадаў. — Толькі нядаўна заарралі мне равы, якія парабілі дзікі і не ведаю, ці варта сеяць збожжа.

— У мяне гектар жыта знішчылі дзікі, а за шкоду заплацілі 400 злотых. Знішчылі таксама частку бульбы і амаль усю агародніну, што трэба было заараць увесь агарод. Хаця я ўвязваю сабаку, дзікі і зубры падыходзяць ажно пад мой дом на акраіне Навасадаў. У суседзяў таксама многа шкоды нарабілі дзікі, — тлумачыць Яўген Лапінскі. — Побач Скрыплева дзікі моцна парылі лугі. Некаторыя гаспадары свае ўчасткі абгароджваюць дротам.

— Алені нішчаць палеткі, асабліва з пшаніцай, да часу, покі не пачнецца іх перыяд гону. Дзікі рыюць на палях і на дарогах увесь час. Кампенсацыі за знішчанае збожжа і бульбу не вернуць нашых тратаў, — гаворыць Галена Шыманюк з Навасадаў.

Іншыя мае суразмоўцы пацвярджаюць, што ў гэтым годзе лясная звярына знішчыла многа збожжа і бульбы ў наваколлі Навасадаў.

У Скупаве, распаложаным на лясной паляне, многія пенсіянеры адракліся ад гаспадарання і іх палі ляжаць аблагом і зарастаюць самасеем.

— Адзін са скупаўскіх гаспадароў пасеяў грэчку, думаючы, што яна не прыйдзецца да густу звярыне, а алені за 2 дні з'елі ўсю грэчку, — кажа Валянцін Васілюк.

Радзей дзікі перапраўляліся на другі бок Навасадаў, або абыходзілі Звадзецкае, ці Казіміры і ззаду сёл шатравалі збожжа і бульбу.

— Калі мой сын даязджаў да Навасадаў з хуткасцю звыш 60 кіламетраў у гадзіну, пад машыну падбег дзік, які перапраўляўся на другі бок вёскі. Пабіў ён цэлы бампер вялікай легкавой машыны. Машына пасля рамонту не будзе ўжо мець той вартасці, якую мела б без аварыі, — гаворыць Валянцін Васілюк.

Як будзе з паляваннямі?

— Ёсць некалькі прычын вялікага знішчэння сельскагаспадарчай прадукцыі на прылясных тэрыторыях. У Белавежскай пушчы жыве намнога больш звярыны, у параўнанні да той колькасці, якая можа пракарміцца ў нашых лясах без шкоды для іх, хаця тычыцца гэта толькі выбраных гатункаў. Паводле падлікаў спецыялістаў, у Белавежскай пушчы жыве тры разы больш дзікоў і прыблізна два разы больш зуброў у параўнанні да арэалу польскай часткі пушчы. Калі з нашага боку пушчы павінна жыць пад 20 ваўкоў, а жыве іх пад 200 штук, то тэарэтычна павінны менавіта яны зрабіць натуральную селекцыю сярод іншай звярыны, але робяць яе толькі ў дачыненні да выбраных гатункаў. Напрыклад, замала ў пушчы аленяў, якіх з'ядаюць ваўкі. Палююць яны на цяжарных і аслабелых пасля родаў ланяў і на аленяў з вялікімі рагамі, заганяючы іх у гушчавіну. Аленям тады цяжка выбрацца і разрываюць іх ваўкі. Затое ўдала перад ваўкамі абараняюцца дзікі і зубры і іх селекцыю павінны рабіць паляўнічыя, — кажа Валянцін Васілюк, які таксама з'яўляецца паляўнічым і добра ведае лясную справу. — Побач Васькоў ваўкі разарвалі ялавіц. Калі прыйшлося выплачваць кампенсацыю, сталі павучаць, што кароў і цялят трэба нанач хаваць дамоў, але ж гаспадарам цяжка гэта рабіць штодзень.

Ялавіц і цялят ваўкі разрывалі таксама побач іншых сёл, што бударажыць гаспадароў.

— Ваўкоў бароняць эколагі, а ліміты, дадзеныя Міністэрствам аховы асяроддзя паляўнічым на адстрэл дзікоў, невялікія і таму іх пагалоўе ў пушчы хутка большае. Калі гаварыць пра зуброў, то ў пушчы праводзіцца толькі кантраляваны адстрэл хворых штук і таму яны хутка размнажаюцца, — гаворыць Валянцін Васілюк. — Я не толькі палюю на звярыну, але і з'яўляюся яе любіцелем. Частку сваёй сельскагаспадарчай прадукцыі развожу па пушчы і падкормліваю звярыну. Моцна здзівіўся я аднак, калі даведаўся, што эколагі прапануюць увогуле спыніць адстрэл звярыны ў Белавежскай пушчы. Цяжка нават сабе ўявіць, што будзе з сельскагаспадарчай прадукцыяй на прыпушчанскіх тэрыторыях, калі б такая прапанова была адобрана. Нашы людзі павінны выступіць у Міністэрства аховы асяроддзя з просьбай пабольшыць колькасць дзікоў і зуброў прызначаных да адстрэлу ў Белавежскай пушчы, бо намнога большыя колькасці звярыны прадугледжаны да адстрэлу ў пушчы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У Белавежскай пушчы палявалі польскія каралі і рускія цары. Пасля палявалі замежнікі, якія за сваё хобі плацілі заходняй валютай. Зараз на паляванні ў пушчу ездзяць члены паляўнічых гурткоў. Сярод людзей меркаванні наконт аховы Белавежскай пушчы падзеленыя. Аднак немалая частка моладзі, якая раней рашуча падтрымлівала меркаванні эколагаў наконт больш строгай аховы Белавежскай пушчы, падтрымае і прапановы цалкавітага спынення паляванняў у Белавежскай пушчы. Але хутчэй за ўсё моцна супраць спынення паляванняў выступяць старэйшыя жыхары прыпушчанскіх вёсак, якія з-за дзікоў кінулі апрацоўваць зямлю. Менавіта выдатная большасць з іх будзе нават за павелічэннем ліміту адстрэлу дзікоў і ваўкоў.

Дары восені

Гмінны саюз пенсіянераў у Нараўцы гэтай восенню сарганізаваў некалькі інтэграцыйных вечарынак для пенсіянераў. Мэтай інтэграцыі з'яўляецца яднанне жыхароў гміны дзеля культурнага жыцця. Пасля вечарыны ў Семяноўцы і Старым Ляўкове 26 кастрычніка адбылася сустрэча ў Нараўцы ў галерэі імя Тамары Саланевіч. Спатканне было прысвечана дарам восені. Старэйшыя ўдзельнікі ўспаміналі мінулае жыццё. Успамінамі дзяліліся Уладзімір Клімюк з Плянты, Павел Леўша, Казімір Касёрак і Ядвіга Карпюк з Нараўкі, Яўген Смольскі з Ляўкова, Юры Мароз з Альхоўкі. Вечарынку ўпрыгожыў спевамі калектыў „Нараўчанкі" пад кіраўніцтвам Пятра Скепкі. Атракцыёнам інтэграцыйных сустрэч з'яўляецца „Мікрафон для ўсіх". Галасістыя і адважныя пенсіянеры па-аматарску прыпамінаюць песні мінулых гадоў. У гэты раз спявалі Вольга Сачко, Павел Леўша, Францішка Красоўская і аўтар гэтага допісу.

Праўдзівымі дарамі восені на сталах былі мёд ад мясцовых пчалаводаў ды хлеб і сыр ад мясцовых гаспадынь.

Нараўчанскі Саюз пенсіянераў налічвае 400 членаў і плённа працуе пад кіраўніцтвам Ядвігі Карпюк.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Новае Ляўкова

Парадак на могілках узялі да сэрца

Пражыў я больш за паўвека. Такога добраўпарадкавання пляцоўкі перад парафіяльнымі могілкамі ў Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна) яшчэ не бачыў.

30 кастрычніка г.г. паехаў я на могілкі, на якіх пахаваны мае дзяды, бацькі ды мая адзіная сястра Марыя (у снежні будзе першая гадавіна яе смерці). І што ўбачыў: зараз паставілі тут не адзін, як было дагэтуль, а два вялікія кантэйнеры для смецця. Вакол іх вялікі парадак, замецена кожная смяцінка. Скасілі і прыбралі траву і пустазелле ўздоўж агароджы. Як жа прыемна паглядзець!

А — як памятаю — яшчэ пару гадоў таму ля могілак 1 лістапада стаяў даўно перапоўнены кантэйнер і ля яго — дзве-тры вялізныя гурбы смецця. Гэтае смецце зімой прысыпаў снег і яно ляжала да вясны — бывала, што і да Правадоў!

Дык вось прыйшоў 2008 год і ля могілак ляўкоўцы навялі парадак. Войт таксама даў грузавік і людзей. Аказваецца, калі хацець, дык можна.

Гайнаўка

Кантрасты на вуліцы

У Гайнаўцы вуліца Арміі Краёвай каля гарадскога амфітэатра ў парку спалучана з вуліцай Белавежскай. Адзін бок гэтай вуліцы — гэты ад амфітэатра — мае новы тратуар. З другога боку вуліцы таксама ёсць тратуар, але ён выбоісты і мае вельмі многа раструшчаных плітак, яго доўга не рамантавалі. Ідучы па ім лёгка скрынуць нагу, а то і перакуліцца.

Ужо час і пара адрамантаваць тратуар, які не надаецца да карыстання. Яго даўжыня — каля кіламетра!

(яц)

Via Carpatia

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беласток, Бельск-Падляшскі, Боцькі і Сямятычы будуць мець, маўляў, непасрэднае спалучэнне на поўначы з Лівтой, а на поўдні са Славакіяй, Венгрыяй, Румыніяй, Балгарыяй і, мабыць, з Грэцыяй. Так будзе пасля пабудовы хуткаснай транзітнай дарогі Via Carpatia, якая на польскім адрэзку мае бегчы паўз усходнюю мяжу, значыць, на г.зв. Усходняй сцяне ад Будзіска да Любліна, Жэшава і далей да славацкай мяжы.

Аб планах гэтай пабудовы гаварылася на мінулым тыдні ў беластоцкім Гасцінным палацыку на адмысловай прэс-канферэнцыі, якую заініцыяваў дэпутат, а заадно старшыня падляшскай Грамадзянскай платформы Роберт Тышкевіч. Удзельнічалі ў ёй віцэ-прэзідэнты Любліна і Жэшава ды, між іншым, падляшскія дэпутаты Лешак Цеслік і Кшыштаф Юргель, прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі, а таксама прадстаўнікі Міністэрства інфраструктуры і Генеральнай дырэкцыі краёвых дарог і аўтастрад (ГДКДіА). Абмяркоўвалася патрэба паскарэння прац адносна пабудовы шляху Via Carpatia. Ідэя яго ўзнікнення нарадзілася ў кастрычніку 2006 г. У той час міністры транспарту Літвы, Польшчы, Славакіі і Венгрыі ў Ланцуце ў час канферэнцыі „Адна дарога — чатыры краіны" рашылі аб неабходнасці спалучэння гэтых краін, значыць, часткі паўночнай Еўропы з паўднёвай. Першапачаткова Via Carpatia мела пралягаць ад Коўна праз Беласток, Люблін, Жэшаў, Прэшаў, Кошыцы да Дэбрэцэна. З часам ідэяй захапіліся Румынія і Балгарыя. У апошні час — Грэцыя, якая — як сказаў у ходзе канферэнцыі ў Беластоку дырэктар дэпартамента палітыкі транспарту і міжнародных спраў Міністэрства інфраструктуры Ірэнеуш Майхер — жыва зацікаўленая праектам. Працягваюцца ўжо працы ў яго рамках над дарожным спалучэннем з Балгарыяй. Генеральна Via Carpatia ў нашым рэгіёне будзе сыходзіцца з дарогай S-18, якая — як гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі — мала атракцыйная і часта яе абмінаюць падарожнікі, сярод іх перш за ўсё турысты. Мае ўзнікнуць да 2015 г., а яе пабудова мае рушыць у будучым годзе. Згодна з інфармацыямі Юзафа Станяшка, намесніка дырэктара беластоцкага аддзела ГДКДіА, цяпер завяршаецца падрыхтоўка г.зв. аналізаў прыродных умоў і рэсурсаў тэрыторыі, неабходных для распачацця гэтай інвестыцыі.

— Via Carpatia на практыцы спалучыць Балтыйскае і Чорнае моры. Гэта мусіць быць кроваварот усёй усходняй Польшчы і мае таксама немалое значэнне для Еўрасаюза. Можа спрычыніцца да павелічэння гандлёвага развіцця і стымуліроўкі развіцця турызму, — сказаў журналістам у перапынку канферэнцыі дэпутат Роберт Тышкевіч.

І дадаў:

— Разам з панам Цеслікам з сеймавай камісіі інфраструктуры пераконваем усіх дэпутатаў з Падляшша, Любліншчыны і Падкарпацця, каб Via Carpatia ўзнікла тэрмінова. Стараемся паскорыць усе дзеянні ў гэтай справе.

— Гэтая дарога патрэбная не толькі рэгіёнам усходняй Польшчы, але і ўсёй краіне, — адзначыў дырэктар Майхер. — Не хочам, каб па гэтай дарозе аўтамашыны толькі праязджалі і спыняліся выключна на бензастанцыях.

Дэпутат Цеслік спаслаўся на ролю, якую можа выконваць Via Carpatia:

— У сярэднім на працягу года ў Падляшскае ваяводства прыязджае каля 500 тысяч турыстаў. Для развіцця рэгіёна гэта нуль. Напрыклад, у Закапанэ толькі па ўік-эндах бывае іх нават ад 100 да 200 тысяч. Мусіць у нашае ваяводства прыязджаць каля 5 мільёнаў турыстаў у год, каб гэта было адчувальным у развіцці рэгіёна. Адной з найважнейшых форм прыцягнення турыстаў з'яўляецца развіццё дарог, а за гэтым прыйдуць інвестары.

У размове з „Нівай" дэпутат Цеслік сцвердзіў, што з яго разлікаў вынікае, што адно гасцінічнае месца дае занятак для трох асоб, а пры такіх хуткасных дарогах як Via Carpatia гатэлі вырастаюць як грыбы пасля дажджу. Прытым асцерагаў:

— Залежыць нам на паскарэнні прац над шляхам Via Carpatia, паколькі з кожным годам на ўсе мэты будзе штораз менш еўрасаюзных грошай.

Агулам гэтая інвестыцыя мае пагдынуць 21 мільярд злотых, з чаго ў 60 працэнтах яна суфінансуецца са сродкаў ЕС (1,5 млрд. зл. на адрэзак Беласток — мяжа Падляшскага ваяводства на рацэ Буг).

Дарога, якая спалучыць часткі Еўропы па абодвух баках Карпат (адтуль і назва), на польскім баку мае налічваць 620 кіламетраў. Будзе з двух бакоў двухпалосная (з часам з кожнага боку мае быць дабудавана па адной дадатковай паласе) з раздзяляльнай паласой у дванаццаць метраў.

Дэпутат Тышкевіч адзначыў:

— Гэта не будзе рэгіянальны, а міжнародны шлях. Спрычыніцца таксама да трансгранічнага супрацоўніцтва з Беларуссю і Украінай.

Дырэктар Майхер:

— Гэтая дарога будзе перасякацца з двума пан'еўрапейскімі калідорамі. Будзе на скрыжаванні ўсіх дарог ва ўсім еўраазіяцкім рэгіёне.

Прытым агаварыўся, што няма яшчэ адназначнага рашэння ўрада аб тым, якая будзе на тэрыторыі Польшчы ўся дарожная транс'еўрапейская сетка. Тым не менш грошы на шлях Via Carpatia ў бюджэце на будучы год ужо гарантаваны.

Залатая восень — залаты век

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

У суботу, 18 кастрычніка, у вясковай святліцы ў Войнаўцы адбылося інтэграцыйнае спатканне членаў Гуртка пенсіянераў і інвалідаў з Дубіч-Царкоўных. Спатканне прымеркаванае было да Дня сеніёра і ўдзельнічалі ў ім запрошаныя госці.

У Войнаўку прыехала 30 чалавек з Гайнаўскага аддзела Саюза пенсіянераў і інвалідаў на чале з яго старшынёю Мікалаем Чыквіным. Гайнаўскіх гасцей сустрэлі старшыня дубіцкага гуртка Галена Бучкоўская і дырэктар Гмінага асяродка культуры, спорту і рэкрэацыі Іаланта Соха. Чакала нас прыгожа аздобленая святліца, а ў ёй — сталы ў тры рады, засцеленыя беленькімі абрусамі і застаўленыя пірожным, фруктамі і шакаладнымі смакоццямі.

Мерапрыемства пачалося з выступленняў дырэктар Іаланты Сохі і лідараў пенсіянерскіх арганізацый — Галены Бучкоўскай і Мікалая Чыквіна. Прамоўцы адзначылі, што сустрэчы дубіцкіх і гайнаўскіх пенсіянераў сталі цыклічнымі, між іншым дзякуючы падтрымцы войта Дубіцкай гміны. Старшыня Гайнаўскага аддзела Саюза пенсіянераў і інвалідаў Мікалай Чыквін і яго сакратар Эдуард Бай уручылі памятныя дыпломы дырэктару ГАКСіР Іаланце Сохе, старшыні гуртка Галене Бучкоўскай і войту Анатолю Паўлоўскаму.

Пасля афіцыйнай часткі на сцэну выйшаў маладзёжны калектыў „Струмок" пад кіраўніцтвам Ігара Фіта, які выканаў беларускія, польскія і ўкраінскія песні. Выступленне мясцовых гімназістак выклікала ў пенсіянераў захапленне і ўдзячнасць — падзякам з боку „старэйшай моладзі" папросту не было канца.

А ў суседняй зале гукаўзмацняльную апаратуру настройвала „Капэла з Дубін" Пятра Скепкі, якая пенсіянерам падыгрывала да танцаў. Неўзабаве выступіў дуэт Раіса Ярымовіч і Пятро Скепка, а разам з імі заспявалі ўсе прысутныя.

У вялікай зале сабралася каля ста пажылых чалавек. Нечакана з іх ліку вылучыліся дуэты, напрыклад, пары Дзмітрукоў, Чыквіных, Баяў, якія па-майстэрску праспявалі песні сваёй маладосці. Іх выступленні публіка абдорвала доўгімі, шчырымі апладысментамі.

Маю ўвагу прыцягнулі пяць прыгожа і густоўна апранутых пажылых жанчын. Гэта былі Надзея Карпюк, Вольга Вільчэўская, Тамара Гаўрылюк, Надзея Шэшка і Надзея Тэлятыцкая са Старога Корніна. У іх выкананні прагучэлі песні пра вайну, гаротнае жыццё і, вядома, пра любоў. А спявалі яны галасіста і ў іх спеве адчувалася, што песні спадарожнічаюць ім усё жыццё.

На дубіцкай сустрэчы спаткаліся два пакаленні — моладзь і пажылыя пенсіянеры. Апошнія на хвілінку сталі маладымі, дзякуючы песням і успамінам, якія так часта вяртаюцца ў восень жыцця.

Што з нашымі грашыма (3)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Расія, Украіна і Беларусь будуць патрабаваць у бліжэйшым часе больш інвестараў з Еўрасаюза, а ў гэтым ліку і з Польшчы. На гэтых рынках мацней інвеставалі прадпрыемствы з Беласточчыны, чым суполкі з іншых рэгіёнаў Польшчы.

Буйнейшыя прадпрымальнікі з Гайнаўшчыны дэкларавалі, што куплялі драўніну ў Калінінградскай вобласці Расіі, на Беларусі, на Літве, а некаторыя нават прывозілі яе з Украіны. Выконваючы вырабы з імпартаванай драўніны, купленай за долары ці еўра, кошты іх прадукцыі нядаўна павысіліся і калі Польскія дзяржаўныя лясы дэкларавалі, што панізяць цану драўніны ў агульным на 10% (напэўна залежна ад якасці — А. М.), павінен моцна абмежавацца імпарт драўніны з Усходу на нашыя тэрыторыі, а ў многіх выпадках можа спыніцца.

— Мы распачалі сваю дзейнасць у Беларусі ўжо ў 1990 годзе і ажно да мінулага года дзейнічала там адно або два нашы прадпрыемствы. Экспартавалі мы перароблену драўніну адразу з Беларусі ў заходнія краіны, а асабліва ў Іспанію. Імпартавалі мы таксама драўніну з Беларусі ў наша прадпрыемства „Васбэль", што дзейнічае ў Звадзецкім, а пасля яна перараблялася ў іншым нашым прадпрыемстве „Паркет Гайнаўка", — кажа саўласнік суполак Валянцін Васілюк са Звадзецкага. — Драўніну куплялі мы таксама на Украіне і многа яе прывозілі з Расіі. З Краснаярскага краю прывозілі мы лістоўніцу. У час вялікай перапрацоўкі мы прывозілі з усходніх краін па 8-10 аўтафураў драўніны штотыдзень. У Польшчы вырабляем мы паркеты, драўляныя вырабы, што выкарыстоўваюцца ў будаўніцтве і паўфабрыкаты для прадукцыі мэблі. Калі перасталі дазваляць вывозіць з Расіі драўніну ў кругляках, сталі мы імпартаваць піламатэрыялы. Аднак калі моцна панізіўся курс злотага, а моцна павысіўся долара і еўра, імпарт драўніны з Расіі стаў увогуле нерэнтабельным і мы яго цалкам спынілі. Яшчэ раней перасталі прывозіць драўніну з Беларусі і Украіны ды спынілі дзейнасць у гэтых краінах.

— Мы раней куплялі сібірскія сосны з далёкай Расіі. Быў гэта вельмі якасны матэрыял, але зараз штораз менш сыравіны прывозіцца з гэтага напрамку. Цяпер лесаматэрыял для нашага прадпрыемства купляем выключна ў Польшчы, — паінфармаваў саўласнік прадпрыемства „Трэс-Поль" з Навасадаў Уладзімір Трашчотка.

Бельскае будаўнічае прадпрыемства „Унібэп" пачало апошнім часам многа будаваць якраз у Расіі і на Украіне. Будавала яно, напрыклад, вялікі гандлёва-паслуговы цэнтр, апартаменты, ці выконвала заказы для фабрык, а апошнім часам мела ўваходзіць на жыллёвы рынак. Нягледзячы на моцны курс злотага, бельскае прадпрыемства магло разлічваць на задавальняючы прыбытак і рабіць большую экспансію на Усход. Цяпер тэарэтычна ў гэтым прадпрыемстве прыбытак з замежных інвестыцый павінен быць яшчэ большым, бо калі разлікі адбываюцца ў доларах або еўра, то за тыя ж самыя зрэалізаваныя кантракты можна зараз атрымаць большы прыбытак, пералічыўшы іх на танны цяпер злоты. Застаецца толькі пытанне як моцна фінансавы крызіс, які вельмі моцна крануў Расію і Украіну, паўплывае на абмежаванне фінансавання банкамі ўжо распачатых і планаваных будаўнічых інвестыцый у гэтых краінах. Калі на Усходзе паменшае запатрабаванне на будаўнічыя паслугі „Унібэп" нават пры танным злотым можа пачаць абмяжоўваць дзейнасць у гэтым рэгіёне і вяртацца на рынкі Польшчы. Толькі што і ў нас прадбачваецца таксама застой у будаўніцтве. Прафесар Станіслаў Гамулка, вядомы эканаміст і саўласнік аднаго з будаўнічых прадпрыемстваў лічыць, што ў наступным годзе запатрабаванне на новае жыллёвае будаўніцтва ў Польшчы (на Падляшшы ёсць падобныя тэндэнцыі) можа панізіцца нават на 30-40%.

Прадпрыемства „Васбель" са Звадзецкага цалкам спыніла імпарт драўніны з усходніх краін, калі моцна панізіўся курс злотага. Валянцін Васілюк паказвае на тры апошнія кучы дошак прывезеных з Расіі, што яшчэ ляжаць на пляцоўцы

Сярод прадпрыемстваў з Падляшша, якія наладзілі больш цеснае супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь, быў нарваўскі „Пронар", які раней купляў рухавікі і зборачныя вузлы для трактароў і іншых машын, якія пасля пачаў замяшчаць сваімі канструкцыямі. Аднак і зараз заказвае многа дэталяў і большых зборачных вузлоў з Рэспублікі Беларусь для сваёй прадукцыі ды вымушаны заказваць запчасткі для раней прадукаваных у сябе трактароў. Многа кампанентаў да машын, прадукаваных у „Пронары", прывозіцца з Беларусі якраз праз семяноўскі пагранпераход. Калі разлікі з беларускімі прадпрыемствамі адбываюцца ў доларах або еўра, пасля патанення злотага падаражаў імпарт выдатнай большасці прадуктаў, што прывозяць з Беларусі суполкі з Падляшша, прадукты якіх могуць стаць менш канкурэнтнымі на польскім рынку. Павінны падаражэць, між іншым, танейшае ад польскага мінеральнае ўгнаенне, што прывозіцца з Беларусі, ці беларускі цэмент. Затое павінны моцна патаннець у нас нафта (аўтол) і прадукты, якія з яе вырабляюцца, ці сталь патрэбная ў будаўніцтве (што ў большасці імпартуюцца з Усходу), калі цана іх вельмі моцна ўпала на сусветных рынках. Аднак на нашых запраўках вельмі марудна і памалу паніжаецца цана бензіну, аўтолу і газу для машын, а ў гайнаўскіх оптавых складах таксама не відаць рэзкага паніжэння цаны вырабаў са сталі. Можна шукаць прычын такога ходу справы ў доўгатэрміновых кантрактах, ці ў танным злотым, але звычайным грамадзянам цяжка зразумець чаму, напрыклад, на адной, ці другой гайнаўскай запраўцы цана аўтолу панізілася толькі на дзесяткі грошай, калі цана за барэль нафты на сусветных рынках панізілася са 140 долараў на звыш 60 долараў.

Гайнаўшчына і ўся Беласточчына мацней супрацоўнічалі з партнёрамі на Усходзе. У бліжэйшым часе крызісу больш праўдападобнае, што суполкі з нашага рэгіёна ў агульным будуць больш выходзіць з усходняга рынку, чым большаць там свае інвестыцыі або пашыраць гандлёвае супрацоўніцтва. Калі стабілізуецца сітуацыя на сусветных рынках і гаспадаркі нашых усходніх суседзяў ізноў хутчэй рвануць уперад, тады таксама павінен пабольшаць гандлёвы абмен паміж Беласточчынай і Усходам і колькасць інвестыцый нашых прадпрыемстваў на рынках нашых усходніх суседзяў. Для аднаўлення імпарту з усходніх краін, напрыклад, драўніны, патрэбнае толькі моцнае падаражанне нашага злотага, што затое можа прытармазіць экспарт у гэтыя краіны.

Прыйшлося сплачваць даўгі

Вялікія расійскія і ўкраінскія суполкі абапіраліся ў сваёй дзейнасці ў вялікай ступені на замежны капітал, што з выкарыстаннем біржаў купляў акцыі гэтых прадпрыемстваў і гэтым самым успамагаў іх інвестыцыі. Зараз гэты заходні капітал уцякае з Усходняй і Сярэдняй Еўропы, а перад усім з Расіі і Украіны, бо лічыць гэты рэгіён нестабільным і многа інвестуе ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША (аб чым сведчыць павышаны курс долара ці еўра). Гэта абазначае, што Злучаныя Штаты Амерыкі, з якіх і выйшаў увесь фінансавы закалот, і заходнія краіны, якіх банкі стаялі на грані банкруцтва, будуць выбірацца з рэцэсіі і гаспадарчага запаволення часткова якраз за кошт Расіі, Украіны і меншых краін Усходняй і Сярэдняй Еўропы (між іншым, Польшчы), адкуль адплывае капітал на Захад. Калі заходні капітал ужо інвеставаў у Рэспубліцы Беларусь, найчасцей укладваў грошы ў прадукцыю і таму цяпер цяжэй вывесці гэтыя сродкі, укладзеныя ў прадпрыемствы ў Беларусі, хаця ў параўнанні з інвестыцыямі на біржах іх размер невялікі.

Як старым...

Пачуў быў я па радыё, якія клопаты ў дамоў апекі, між іншым у Дома спакойнай старасці ў Старыне, што ў гміне Дубічы-Царкоўныя, які курыруе Польскі камітэт сацыяльнай дапамогі (ПКСД) у Варшаве. Праз дзень па радыё зноў пачуў выказванні войта Дубіцкай гміны Анатоля Паўлоўскага, працаўнікоў ПКСД ды электрыкаў з Беластока, якія адцялі электраток старэчам. Тут аказалася, што працаўнікоў з Варшавы падвялі камп'ютары, хоць электрастанцыя ў Беластоку высылала ім рахункі за электраэнергію ў Старыне. Войт сказаў, што калі б яго камп'ютарная сістэма папсавалася на тры месяцы, дык гміна ўвогуле перастала б дзейнічаць! Хто паверыць у такое, што ў агульнадзяржаўнай урадавай арганізацыі перасталі служыць камп'ютары! І што няма грошай каб заплаціць за святло. Войт Паўлоўскі сказаў, што вывозіць са Старыны нечыстоты, ды за гэта яму не пляцяць, але і так гміна будзе адтуль вывозіць смецце. Можна толькі падзякаваць войту за паставу і станоўчае стаўленне да старэчаў з дома спакойнай старасці. Не іх жа ж віна ў тым, што ў краіне непарадкі.

Усё даражэе — ад іголкі і ніткі, а не скажаш, што цэнтральныя органы клапоцяцца пра пенсіянераў. Растрацілі таксама і грошы што былі на пенсіи, а спасылаюцца на сусветны крызіс! Пенсіянеры, цяпер 70-80-гадовыя, цяжка працавалі ўсё жыццё, адбудоўвалі разбураную ў час вайны нашу краіну, сяляне дастаўлялі прадукты за бясцэнак, у абавязковых пастаўках: бульбу, жыта, малако, мяса. Часта даводзілася селяніну самому абысціся мясам: апошняга парсюка, бывала, забіраў секвестратар, а калі селянін не спраўляўся з абавязковымі пастаўкамі, дык і ў турме пасядзеў! Нажыліся! І каб хоць тая старасць спакайнейшаю была нам!..

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Мае ўражанні ад Трэцяга вечара

24 кастрычніка 2008 года меў я гонар удзельнічаць у Трэцім вечары беларускай культуры, арганізаваным у Беластоку Культурным цэнтрам Беларусі. Узрадавала мяне перавыданне Евангелля на беларускай мове гайнаўскім выдавецтвам „Братчык", усцешыла таксама чарга ахвотных набыць святую кнігу. Для мяне гэта доказ таму, што Божае слова на роднай мове нам неабходнае.

Таксама ўзрушыла мяне выстаўка „Манастыры Беларусі і Афона". Для гледача стварыла яна магчымасць сустрэчы з выявамі манастырскіх мясцовасцей, ад якіх выпраменьваюцца святло і дабрыня. Але гэта не толькі маё адчуванне. Шмат удзячных слоў, водгукаў пачуў я ад іншых наведвальнікаў выстаўкі. Аглядаючы экспазіцыю, адчуваеш, што сэрца заўсёды будзе жыць надзеяй, што душа шукае святла, духоўнай падтрымкі.

Віктар БУРА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Паўл Гжэсь у Замку Уяздоўскіх!

Рэдакцыя „Зоркі" мае гонар павіншаваць нашага сябру Паўла Гжэся з творчым поспехам. Ён атрымаў вылучэнне ў конкурсе SAMSUNG ART MASTER 2008. У якасці ўзнагароды — выстаўка ягоных фатаграфій у Цэнтры сучаснага мастацтва ў Замку Уяздоўскіх у Варшаве (CSW Zamek Ujazdowski).

Фатаграфіям Паўла прысвечана адна зала. Фатограф ставіць крытычнае пытанне сітуацыі, у якой ён сам апынуўся:

— Што Ты зрабіў бы, каб Твае творы паказалі ў Цэнтры сучаснага мастацтва ў Замку Уяздоўскіх?

На пытанне адказваюць яго сябры фатографы. Сярод найбольш самакрытычных адказаў — такое вось выказванне: *пасыпаўся б мукой* або *тры разы сказаў бы „здраваську"!*

Дзевяць адказаў ілюструюць дзевяць фатаграфій. Паміж словам і вобразам адчуваецца своеасаблівая ігра. За памяркоўнымі або крытычнымі адказамі стаяць вялікія мары маладых. Без іх, дарэчы, немагчыма дасягнуць творчых поспехаў.

На пытанне, пастаўленнае Паўлам, адказалі не толькі яго сябры, але і вядомы польскі журналіст Яцэк Жакоўскі, які павёў урачыстае падвядзенне конкурсу. Праўда, пытанне Паўла ён паставіў наадварот:

— Якое значэнне для прэстыжных галерэяў мае прэзентацыя творчасці маладых?

І адказаў:

— Вы прыносіце з сабой тое, што будзе заўтра!

У конкурсе прыняло ўдзел больш за 500 маладых мастакоў і фатографаў з усяе Польшчы. Сярод вылучаных лаўрэатаў (каля 20 асоб) найбольш было студэнтаў Познаньскай акадэміі мастацтваў.

Паўл Гжэсь — ураджэнец Гарадка, студэнт Варшаўскай палітэхнікі і школы фатаграфіі ў Чэхіі. У першыя гады сваёй вучобы ў ПШ у Гарадку ўдзельнічаў у Сустрэчах „Зоркі". Напрыканцы мінулага года працаваў членам журы нашага фатаграфічнага конкурсу „Беларус у Еўрасаюзе". Сваім вопытам ён ахвотна дзеліцца з маладымі беларусамі. Ён удзельнічаў у XXI Сустрэчах „Зоркі" і сёлетнім беларускім летніку для дзяцей з Беластока.

Выстаўка „Маладыя мастакі" працуе з 14 лістапада па 7 снежня 2008 года.

Шчыра заахвочваем вас заглянуць у мастацкую галерэю і падумаць што вы самі адказалі б на пастаўленае Паўлам пытанне?!

ЗОРКА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Паўл Гжэсь з „Зоркай"

Сандра любіць казкі!

Дарагія сябры! Сёння вашай увазе прапануем малюнак Сандры Грыцук з Гарадка. Сандра — першакласніца.

— Ужо ў прадшколлі яна звярнула на сябе ўвагу, — кажа Ганна Гжэсь, настаўніца беларускай мовы ў Гарадку. — У яе малюнках такая спантаннасць, весялосць!

Настаўніца сама прывезла малюнкі Сандры ў рэдакцыю. Яны нам спадабаліся. Найперш за шчырасць і радасць, якую малюе маленькая мастачка. І за казкі, якія любіць дзяўчынка.

Сандры жадаем, каб развівала свае здольнасці! Чакаем яе новых малюнкаў.

А вам, даражэнькія, напамінаем, што вы таксама можаце даслаць нам свае мастацкія спробы, малюнкі, фатаграфіі, вершы і апавяданні. Можа ў будучыні пойдзеце следам Паўла Гжэся, пра якога сёння пішам у „Зорцы"!

ЗОРКА

Міра ЛУКША

Собаль з Сабалева

Собаль з Дамай —
намаляваў карціну дзядзька Лёня
і не з Сабалева родам, не сягоння.
Мастаку сказала Дама: „Ягамосці,
крыху я на вас, пан Лёня, у злосці,
бо не Собаль тут найважны ў раме.
Пане Лёня, чэсць аддайце Даме!"
Леанарда ў вус пусціў усмешку прама:
„Ці то Собаль, ці то можа Дама
найважнейшая ў гэтым Сабалеве?..
Ну, хай будзе! Гонар дайма Еве!"

Зося з першага „а” класа

— 7 —

Зося Гняздоўская не заўважыла як праляцелі тры месяцы вучобы ў ліцэі. За гэты час яна пасябравала з хлопцамі, пазнаёмілася з настаўнікамі. У яе былі нядрэнныя ацэнкі. Шкада толькі, што новая вучаніца не хацела гаварыць з Зосяй. Дзяўчына была прыбітая тым, што ў яе класе не было больш дзяўчат. Вядома, з хлопцамі пра ўсё не пагаворыш...

Выхавацель Янка Рыбачук прыкмеціў, што „новая” і Паўл ізалююцца ад класа.

— Клара, сёння ты будзеш сядзець за адной партай з Зосяй! — загадаў ён.

Бландзінка зірнула на яго як на нешта смярдзючае і надалей сядзела з Пятрушэнем.

— Калі ты мяне не слухаеш, — абурыўся настаўнік, — дык мусіш пагаварыць са школьным псіхолагам!

— А ці можна мне яго наведаць у гэты момант? — спытала Клара.

— Так, ідзі... — дазволіў Рыбачук. — А ты, Паўлік, сядай з Зосяй.

Клара ў выдатным настроі пакінула клас. Яна больш нагадвала дзяўчыну пасля паспяховых пакупак чым вучаніцу, якую выгналі з урока. Калі Паўл Пятрушэня прысеўся да Зосі, ён дэманстратыўна сеў у сам канец парты. Зося ў ягоным сшытку па фізіцы прыкмеціла шмат паправак, памечаных чырвонай аўтаручкай. Цікава, хто правіць яму задачы? Спадар Рыбачук не аглядаў яшчэ іх сшыткаў. І дзіўная справа... Асоба, якая сачыла за поспехамі Паўла, мела такі самы почырк як іх настаўніца хіміі спадарыня Ясінская. Зося адчула, што за гэтым скрываецца нейкая таямніца.

Янка Рыбачук быў вымушаны на пяць хвілін пакінуць клас. Ён папрасіў Зосю, каб яна наглядала за парадкам у класе.

— Можаш сесці на маё месца, — прапанаваў ёй.

У гэты дзень усё мела прысмак скандалу.

Калі толькі Зося села на ганаровае месца, у залу ўвайшоў дырэктар Баршчэўскі. Ён прывёў з сабой Клару.

— Што тут дзеецца? — крыкнуў мужчына. — Няма настаўніка, вучаніца вядзе ўрок, а гэтая прыгажуня плача ў прыбіральні...

— Але.. — пачала Зося. — Спадар Рыбачук неўзабаве вернецца.

— Маўчы! — крыкнуў Баршчэўскі. — Я сам ведаю што тут зрабіць.

Сапраўды, праз момант вярнуўся выхавацель. Калі ён пабачыў дырэктара і Клару, моцна спалохаўся.

— Як вы маглі прагнаць такую вучаніцу з класа? — пачаў дырэктар.

— Я хацеў добра, — стаў апраўдвацца Рыбачук. — Я выслаў яе да школьнага псіхолага.

— У нашай школе няма псіхолага! — знерваваўся дырэктар. — І думаю, што неўзабаве не будзе таксама аднаго настаўніка фізікі!

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн:majeszkorowu@tlen.pl

Вершы Віктара Шведа

Парада

Настаўніца гэтак
Запытала Марту:
— Чаму на мяне ты
Глядзіш так упарта?

— Пані ж, — у сакрэце
Сказала ахвоча: —
Трэба небяспецы
Глядзець проста ў вочы.

Колькі гадоў дзеду?

Настаўнік запытаў Альфрэда:
— Колькі гадоў твайму дзеду?
— Колькі гадоў за плячыма —
Мне палічыць нематчыма.

Нібыта будзе таксама —
Як гады таты і мамы.
Я толькі ведаю адно:
У нас жыве даўным-даўно.

Музыка з кайфам

Тамаш Суліма: Цяжка быць рэцэнзентам уласнай творчасці

(працяг з № 46)

Пра сутнасць свайго мастацтва распавядае Тамаш Суліма

— Словы з музыкай ствараюць песню. Як пошукі формы адносяцца да змястоўнасці Тваіх песень.

— Гэта, што ствараю, напэўна можна назваць песнямі. Але мне хочацца глянуць на іх з іншага боку. Хачу пакінуць публіцы больш месца на інтэрпрэтацыю песні. Калі выступаю, гэта мае для мяне нейкі сэнс, а песні разумею ў такі ці іншы спосаб. Слухачы затое, магчыма, разумеюць мае кампазіцыі зусім па-іншаму, знаходзяць іншы сэнс. Нават я. Часам, калі паўстане песня, проста мне падабаецца, але калі выйду на сцэну, бывае, што зусім мне ў такой форме перастае падабацца. Выступ стварае сэнсы ў час самога выканання. Невядома да канца як будзе выглядаць выступ і гэта з'яўляецца самым цікавым, паўстае тады такі перформенс. Тое, што я раблю на сцэне, гэта такое музычнае эсэ. Ідэя, якая побач са мной, гэта мастацтва, якое не мае канца. З мастацтва можна пачаць, але немагчыма яго абмежаваць.

— Чым займаешся між „Бардаўскімі восенямі”, бо мы Цябе бачым толькі ў час фестывалю.

— Гэта праўда. Я нават сказаў сёлета са сцэны, што я верны „Бардаўскай”. Я лічу гэты фестываль натуральным для сябе, я нарадзіўся ў Бельску, я бельшчанін. Былі, праўда, планы выступаць па-за Бельскам, але па розных прычынах яны не здзейсніліся. Калі аднак нехта лічыць мяне мастаком, аўтарам (а сам пра сябе так не думаю), то таму, што я прыналежу аднаму фестывалю.

— Калі Ты выступаеш толькі на гэтым фестывалі, то разлічваеш на выступ штогоду? Можна думаць такімі катэгорыямі?

— Не, увогуле думаю, што за год не выступлю, а калі то прынамсі не як Тамаш Суліма. З'явілася такая новая ідэя, якая называецца „Кэнды бэнд” і думаю, што хутчэй у такой форме паспрабуем нешта зрабіць. Ужо ў гэтым годзе мы выступалі ў фае неафіцыйна, так што можна было нас пачуць.

— Што салодкага знойдзем у гурце „Кэнды бэнд”?

— Цяжка гэта назваць гуртом. Гэта такі шырокі праект, ініцыятыва. Кожны можа прыняць у ёй удзел. Мы проста сустракаемся ў любых месцах і прабуем нешта рабіць.

— Адным словам, добра гуляеце.

— Ну так, толькі варта памятаць, што толькі добрае мастацтва з'яўляецца гульняй, а гульня не заўсёды бывае мастацтвам.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 47

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 43:

Код, самавар, прага, запрашэнне, каштан, кут, дама, сын, ера, арамат. Спакуса, Карпаты, марш, на, агат, ваша, эндэм, кран, арт, мат, дылема, агарод.

Узнагароды, кампакт-дыск „Па дарозе” гурту „Ilo&friends”, выйгралі: **Габрыеля Снарская, Габрыель Кузьмін** з Бельска-Падляшскага, **Агнешка Мароз** з Гайнаўкі. Віншуем!



„Дакопіны” з беларускай культурай

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

На беларускіх народных аглядах часта паказваюцца вясельныя, хрысцінныя і жніўныя абрады, яшчэ добра вядомыя пакаленню нашых бацькоў. Але якраз „дакопіны” і іншыя абрады, якія спадарожнічаюць уборцы бульбы, прэзентуюцца ўжо рэдка, бо яны і раней звяліся з нашых палёў. Калі ў поле выйшлі бульбакапалкі, звялося капанне бульбы ў кампаніі суседзяў з супольнымі вячэрамі на полі. Завяршыўшы ўборку бульбы, якая пры народнай уладзе масава прадавалася на Шлёнск і ў Савецкі Саюз, мужчыны хутка браліся за пасяўную, а жанчыны за выбіранне агародніны і традыцыя „дакопінаў” пайшла ў забыццё.

Да народнай беларускай традыцыі „дакопінаў” рашыліся вярнуцца працаўнікі Нарваўскага дома культуры, якія ў розных мясцовасцях гміны ладзяць беларускія мерапрыемствы з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя”. Сёмага лістапада ў Трасцянцы ў вялікім памяшканні дэпо мясцовай добраахвотнай пажарнай аховы наладзілі яны беларускае мерапрыемства. Зараз у дэпо працуе філіял Нарваўскай гміннай бібліятэкі. На беларускае мерапрыемства зала была прыздоблена макаткамі і народнымі ручнікамі. Жыхары Трасцянкі моцна трымаюцца праваслаўя, таму і на сцэне была павешана ікона, перад якой у мінулым людзі маліліся, распачынаючы кожную працу. Матыкі, якімі карысталіся маладыя людзі прэзентуючы „дакопіны”, яшчэ і зараз з’яўляюцца асноўнай прыладай працы ў Трасцянцы. Старэйшыя жыхары, якія ў большасці запоўнілі вялікую частку глядзельнай залы, садзяць цяпер бульбу ў сваіх агародчыках і ўбіраюць яе з дапамогай матык. Выступаючыя на сцэне карысталіся таксама іншымі старымі прыладамі працы і вопраткай узятай з куфраў бабуляў, што спадабалася і малодшай публіцы, якую моладзь і дзеткі захапілі перад усім сваім акцёрствам.

„Дакопіны” паказваліся з багатым сцэнічным афармленнем і абапіраліся на аўтарскія дыялогі

Амалоджаная Трасцянка

Сама Трасцянка — у мінулым наогул беднаватая вёска, з вузкімі панадворкамі і невялікімі дамамі — розніцца зараз нават ад той вёскі пятнаццаці- ці нават дзесяцігадовай даўнасці. Жыхары сяла і выхадцы з яго, якія вяртаюцца на летні адпачынак або нават і на пастаяннае жыхарства, перайшоўшы на пенсію, аднавілі перад усім дамы. Хлявы і клуні рамантуюцца імі з прызначэннем для гаспадарчага выкарыстання на гарадскі лад. Аднаўленне вёскі адбывалася ў двух напрамках: вяртання да традыцыі і капіравання элементаў гарадской архітэктуры. Масавае аднаўленне разнаколерных навугольнікаў і аканіц адбывалася ў рамках праграмы дафінансаванай з вонкавых сродкаў, што ў спалучэнні з модай на перакрыванне дамоў каляровай бляхай, зрабіла сяло больш ажыўленым. Не хачу выказвацца за этнографаў ці архітэктараў наконт станоўчых і адмоўных змен у ходзе рамонтаў, але напэўна вёска амаладзілася. Раней адноўлена было таксама пажарнае дэпо.

„Дакопіны”, наладжаныя якраз у Трасцянцы, супадаюць з мясцовымі традыцыямі, бо якраз на горшай якасці землях, што акружаюць Трасцянку, вырошчванне бульбы і свінагадоўля давалі мясцовым гаспадарам заўважальны прыбытак. Хаця ўборка бульбы была цяжкім заняткам, асабліва для мужчын, якім трэба было перагрузіць шмат мяшкоў, з малодшых гадоў найчасцей засталіся ім добрыя ўспаміны. Добрым спосабам, каб успамінамі вярнуцца ў сваё дзяцінства і маладосць, было якраз спатканне з дзеткамі і моладдзю. Калі ў час выступаў я ўбачыў усмешкі на тварах старэйшых жыхароў Трасцянкі, зразумеў, што яны амаладзіліся ў час спаткання са сваёй культурай і вяртання ўспамінамі ў цікавейшыя для іх часы.

— У наступным годзе хочам паказаць „Хрысціны” ў Ласінцы і „Вяселле” ў Нарве, якой жыхары сталі скардзіцца, што абмінаем гмінны цэнтр з нашымі мерапрыемствамі, — заявіла дырэктар НАК Тамара Юшкевіч (на другім плане вучні з Падставовай школы і Публічнай гімназіі ў Нарве)

Вяртанне да традыцый

Мерапрыемства пачалося з беларускай песні пра родную вёску. Выклікала яна эмоцыі сярод сабраных, асабліва тых людзей, што выехаўшы ў горад, згодна са словамі песні, знайшлі дарогу ў сваё роднае сяло. Першай сцэнкай у выкананні вучняў нарваўскай школы былі „Дажынкі”. Моладзь прадставіла і цяжкую працу на полі, і стаўлянне перапяліцы. Адказ на пытанне чаму восенню ў Нарваўскай гміне вярнуліся да дажынак дала дырэктар Нарваўскага асяродка культуры.

— Мы „Дакопінамі” канчаем сёлетнія мерапрыемствы з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя” (раней выступы вучняў адбываліся ў Крыўцы і Тыневічах — А. М.). Будзем сёння паказваць таксама „Дажынкі”, якія мелі прэзентаваць у час вялікага гміннага мерапрыемства, якое было спалучанае з Ваяводскімі дажынкамі ў Гайнаўцы і там мы ўжо не выступілі з нашай сцэнкай, — кажа дырэктар НАК Тамара Юшкевіч, якая не раз заяўляла, што хоча беларускую культуру прыблізіць вясковым жыхарам з розных куткоў гміны. — У наступным годзе хочам паказаць „Хрысціны” ў Ласінцы і „Вяселле” ў Нарве, якой жыхары сталі скардзіцца, што абмінаем гмінны цэнтр з нашымі мерапрыемствамі, а ў плане арганізаванне яшчэ і колішняй вясковай забавы.

Каб развесяліць публіку, нарваўскія гімназісты падрыхтавалі жартоўную п’есу „Пярэстая красуля”. У час гэтага прадстаўлення вучні ўмела паказалі свае тэатральныя здольнасці, бо ў час вяртання да традыцый трэба было захаваць каноны паводзін нашых людзей у мінулым. У час трэцяй і галоўнай сцэнкі „Дакопінаў” моладзь абаперлася на аўтарскія дыялогі, якія маглі весціся паміж вяскоўцамі ў час уборкі бульбы ўручную. Падрыхтавалі яны многа рэквізітаў, расклалі вогнішча, пры якім бяседавалі пасля заканчэння работы, мяшкі з бульбай, ці калыску з маленькім дзіцём, якое ў мінулым нават у час халодных восеньскіх дзён часта прабывала з бацькамі на полі і гартавалася да пазнейшай цяжкай працы земляроба. Моладзь мела нагоду паказаць свае акцёрскія здольнасці, але каб удалымі атрымаліся іх выступы, трэбы было ўмела падрыхтаваць маладых людзей да прэзентацыі абрадаў і жартоўнай сцэнкі. Рыхтуючы вучняў да мерапрыемства ў Трасцянцы, велізарную работу зрабіла настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк з Нарвы, якая моцна напрацавалася таксама рыхтуючы вучняў да папярэдніх сустрэч з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя”. Гэтая настаўніца многа прыватнага часу адводзіць пазакласнай рабоце з вучнямі. Падрыхтавала яна тры новыя прадстаўленні на беларускай мове. Нарваўскія гімназісты ўдала вялі спатканне, у час якога са сцэны гучалі беларускія песні ў выкананні дзетак з падставовай школы і гімназіі.

— Наш новы нарваўскі вакальны калектыў, што будзе спяваць па-беларуску, вядзе Магда Уладарчык з „Маланкі”, а дзетак да выступаў з мясцовымі песнямі рыхтавала настаўніца Ірэна Дулько, — тлумачыць дырэктар Тамара Юшкевіч.

Вядучыя звярталі таксама ўвагу на Данеля Гаралеўскага, апекуна новазаснаванага калектыву Нарваўскага асяродка культуры, які таксама выступаў у Трасцянцы.

Вярнуць тэатральны гурток

На папярэдніх мерапрыемствах з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя” вялікую актыўнасць праяўлялі дзеткі і моладзь з Ласінкі і навакольных сёл, якія, пад кірункам здольнага і працавітага інструктара НАК Паўліны Пашко, займаліся ў тэатральным гуртку. Сцэнарый да многіх сцэнак пісала ім былая бібліятэкарка Аліцыя Станько. Дзеткі і моладзь, выступаючы з яе тэкстамі на ласінскай гаворцы, дабіваліся поспехаў на конкурсах і патрапілі зацікавіць публіку.

— Наш інструктар Паўліна Пашко выйшла замуж і ўжо ў нас не працуе. Перастаў таксама дзейнічаць тэатральны гурток у Ласінцы, а зараз вучні з гэтага сяла выступаюць у сцэнках падрыхтаваных пад кірункам настаўніцы беларускай мовы Ніны Абрамюк, — інфармуе дырэктар НАК Тамара Юшкевіч. — Добра было б, каб гмінныя ўлады прынялі на працу новага інструктара, які мог бы разгарнуць тэатральныя здольнасці дзетак і моладзі з Ласінкі, якія станоўча вылучаліся на фоне ўсёй гміны.

Можна ставіць у прыклад

З жыхарамі Трасцянкі і навакольных вёсак мелі нагоду спаткацца ў мілай атмасферы прадстаўнікі мясцовай удады, сярод якіх быў старшыня Рады Нарваўскай гміны Яўген Дудзіч, які дапамагае ладзіць беларускія мерапрыемствы па сёлах. Дырэктар Нарваўскага асяродка культуры Тамара Юшкевіч, канешне, са згоды войта і пры яго падтрымцы дала новы і покі моцны подых у напрамку набліжэння беларускай культуры да мясцовага насельніцтва, арганізуючы мерапрыемствы ў крыху прызабытых, калі гаварыць пра спатканні сялян з культурай, вёсках, такіх як Тыневічы (раней „Тыневічанкі” былі рухавіком культурнага жыцця вёскі), ці Трасцянка. Думаю, што працаўнікі асяродкаў культуры і войты іншых нашых гмін могуць смела браць прыклад з Нарваўскай гміны, маючы на ўвазе арганізаванне беларускіх мерапрыемстваў у штораз новых сёлах.

Культурны цэнтр Беларусі

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Адчыніў свае дзверы Культурны цэнтр Беларусі, які займеў сядзібу па вуліцы Модлінскай, 2, у Беластоку, адмысловым вечарам з мастацкім паказам. У новаадрамантаваным арандаваным будынку на Баярах 6 лістапада гг. сабралася больш за сто асоб.

— Сабраліся тут усе, хто дбае аб пашырэнне сувязей Беларусі з Польшчай, — адзначыў саветнік Пасольства Беларусі ў Польшчы, дырэктар Цэнтра Аляксандр Карачун. — Пачаў наша мерапрыемства цудоўны калектыў з Беларусі „Неруш".

Спадар дырэктар рады быў прывітаць пасла Беларусі Паўла Латушку, генеральнага консула РБ у Беластоку, праваслаўнае духавенства, кіраўніцтва горада Беластока, Маршалкоўскай управы, кіраўнікоў прадпрыемстваў, дырэктараў беларускіх ліцэяў і Пачатковай школы № 4 у Беластоку, настаўнікаў беларускай мовы, кіраўніцтва гарадоў Гайнаўкі, Бельска, Сямятыч, гмінных улад Гайнаўшчыны, Бельшчыны, Сямятыччыны, а таксама Драгічына, Чаромхі, Чыжоў, Гарадка, кіраўніцтва БГКТ, творцаў культуры.

Дырэктар Цэнтра Аляксандр Карачун

Пачатковая школа № 4 у Беластоку, дзе вывучаецца беларуская мова, у падарунак атрымала ноўтбук. На першым плане настаўніца гэтай школы Аліна Ваўранюк і яе дырэктар Збігнеў Клімовіч

— Я лічу, што тыя людзі, якія сёння сабраліся ў нашым цэнтры, прыхільныя да беларускасці, да беларускай культуры, будуць вельмі прыемнымі і вельмі шаноўнымі гасцямі нашага дома, — адзначыў спадар дырэктар і прадставіў слова паслу РБ, які канчае ўжо сваю дыпламатычную місію ў Польшчы.

— Я бачу сярод сабраных гасцей нашых добрых сяброў, — заўважыў пасол РБ Павел Латушка, які пералічыў з імя і прозвішча амаль усе сабраныя асобы, — сяброў добрых адносін паміж Беларуссю і Польшчай. Я цешуся з таго факта, што як пасол Беларусі я магу быць з вамі сёння. Мы адкрываем гэта памяшканне дзеля таго, каб тут адбываліся беларускія мерапрыемствы, якія будзе ладзіць Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы.

Цэнтр будзе працаваць дзеля добрых адносін у сферы культуры паміж нашымі краінамі. Я хацеў бы яшчэ раз падкрэсліць, абсалютна афіцыйна, што цэнтр беларускай культуры, які мы ствараем у Польшчы, мае адну галоўную мэту: гэта культура. Культура, як нам падаецца, складаецца з трох частак, і чым будзе займацца цэнтр: перадусім гэта прамоцыя беларускай культуры, якая багатая, якая з'яўляецца часткаю еўрапейскай культуры. Гэта арганізацыя розных беларуска-польскіх мерапрыемстваў, на карысць Польшчы і на карысць Беларусі, таму што менавіта беларуска-польскія мерапрыемствы ствараюць лепшую атмасферу ў нашых адносінах. І трэцяя мэта, гэта дапамога беларусам, якія пражываюць у Польшчы, беларускай меншасці. Мы лічым, што меншасці, якія аб'ядноўваюць нашыя народы, польская ў Беларусі і беларуская ў Польшчы, — з'яўляюцца менавіта тым элементам, які спрыяе развіццю добрых адносін паміж нашымі краінамі. Так было, ёсць і я ўпэўнены, што будзе. Цэнтр пачынае сваю дзейнасць у Польшчы, правялі Дні беларускай культуры ў Катавіцах, у Варшаве, а трэці беларускі вечар — у Беластоку. Сёння — адкрыццё гэтай выставы. Мы будзем старацца арганізаваць мерапрыемствы ў Польшчы ўсюды там, дзе будзе запатрабаванне на культуру — беларускую, на беларуска-польскія культурныя мерапрыемствы. Будзем спрыяць прадстаўленню польскай культуры на Беларусі. Я паўтаруся: канешне, чалавек жыве эканомікай, гаспадаркай, бо ж есці трэба, але трэба каб была лепшая атмасфера ў адносінах паміж людзьмі. А гэтаму дапамагае культура. Адкрываючы памяшканне Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы мы хацелі б таксама зрабіць сімвалічныя падарункі для беларусаў, якія тут памятаюць пра свае карані, пра беларускае слова, пра беларускую культуру і ўручыць падарункі з нагоды гэтай урачыстасці. Урадам Беларусі прынята праграма „Беларусы ў Польшчы". Мы атрымоўваем адпаведнае дафінансаванне дзеля таго, каб дапамагаць у правядзенні розных культурных мерапрыемстваў — беларускіх і беларуска-польскіх — у Польшчы.

Беларускае грамадска-культурнае таварыства атрымала ў падарунак камп'ютар. Пасол РБ хацеў асабліва падзякаваць белліцэям у Гайнаўцы і Бельску-Падляшскім, куды ён наведваўся часта як пасол, і ўручыў кіраўніцтву школ музычныя цэнтры. Музей і асяродак беларускай культуры адораны каляровым тэлевізарам. Пачатковая школа № 4 у Беластоку, дзе вывучаецца беларуская мова, у падарунак атрымала ноўтбук, Дзіцячы садок № 14 у Беластоку — тэлевізар і два DVD.

— Культурны цэнтр Беларусі, у рамках рэалізацыі сваёй праграмы, заініцыяваў таксама набыццё баянаў для калектыву „Прымакі" і для Гайнаўскага дома культуры, для гайнаўскага хору, — працягваў спадар пасол. — Мы прынялі рашэнне таксама дафінансаваць у суме 5 тысяч долараў выданне Літаратурным аб'яднаннем „Белавежа" кнігі беларускіх аўтараў. Шмат яшчэ іншых культурных мерапрыемстваў, наколькі будзе гэта магчыма, сімвалічна падтрымаем злотым ці беларускім рублём, дзеля таго, каб гэты рубель ператвараўся ў добрую справу, у добрыя адносіны. Не палітычныя, а менавіта ў культурныя. Маюць у нашым цэнтры адбывацца і беларускія вечарыны, выставы, выступленні беларускіх пісьменнікаў, паказ кіно — плануем набыццё адпаведнага абсталявання, і невялікія канцэрты. Вядома, усё гэта будзе адбывацца не толькі тут, на Беласточчыне, але і ва ўсёй Польшчы.

Гурт „Неруш"

Пачала мерапрыемства і працягвала канцэрт фольк-медыя-група „Неруш" з Мінска і эстрадны ансамбль беларускай меншасці „Ас" з Беластока. „Неруш", калектыў вядомы ўжо і ў Польшчы, выступіў з двума канцэртамі на Беласточчыне. А на свежаадноўленых сценах сядзібы цэнтра пачала сваё жыццё экспазіцыя творчай мастацкай сям'і Тамары і Аляксандра Батаковых-Мацвеенкаў з Мінска, вядомай творчай мастацкай дынастыі — „З любоўю да зямлі" (больш за 40 прац). Тамара Батакова спецыялізуецца ў манументальным жывапісе, абое яны распісваюць таксама цэрквы. Асноўная частка выставы гэтай сям'і будзе адкрыта ў Музеі і цэнтры беларускай культуры ў Гайнаўцы.

— Мы пацвярджаем сваю прынцыповую лінію, каб у гайнаўскім Беларускім музеі былі пастаянныя лепшыя дакументальныя і мастацкія выстаўкі з фондаў беларускіх музеяў, каб гайнавяне, іх госці і жыхары Беласточчыны маглі больш знаёміцца з найлепшымі творамі беларускай культуры, — заявіў Тадэвуш Стружэцкі, саветнік Пасольства Беларусі ў Польшчы па справах культуры.

Будынак Культурнага цэнтра Беларусі ненайвялікшы (200 кв. м.), месціць дзве выставачныя залы, рабочыя кабінеты, гасцінічныя пакоі (на 7 асоб), ёсць у ім памяшканне для размяшчэння бібліятэкі. Тут і ў іншых гарадах Польшчы будуць арганізоўвацца мерапрыемствы, якія будуць збіраць аматараў і прыхільнікаў беларускай культуры і добрасуседскіх адносін.

Людзі беларускай культуры Беласточчыны

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Згадка пра Надзею Ільяшэвіч

У „Ніве” (№ 39 ад 28.09.2008 г.) прачытала я згадку Канстанціна Масальскага пра Надзею Ільяшэвіч. Хацелася б пабачыць тыя пасведчанні, пра якія ўспамінае аўтар допісу. Я ў сваім хатнім архіве маю здымкі са школы ў Тапалянах, якія атрымала ад Марыі Марліч (дачкі Надзеі і Хведара Ільяшэвічаў) са Шчэціна. На адным з іх (рэпрадукуецца побач) бачна картачка з надпісам „Беларуская школа ў Тапалянах”. На жаль, не відаць які гэта быў школьны год. На адвароце здымка пазначана, што такая была ў 1946 г. На ім апрача дзяцей відаць і настаўнікаў: Сяргея Назарку, Вінцэнта (Уладзіміра) Маркевіча, а. Грыгорыя Стальбоўскага і Надзею Ільяшэвіч. На іншых здымках з 1946 г. выразна бачны шыльда „Publiczna Szkoła Powszechna w Topolanach” і ўжо толькі двух настаўнікаў: Надзея Ільяшэвіч і Вінцэнт Маркевіч.

Фота з архіва Лены Глагоўскай

Фота з архіва Лены Глагоўскай

Надзея Ільяшэвіч, з дому Алексяюк, нарадзілася ў лістападзе 1905 г. (паводле афіцыйных паваенных дакументаў — 1907 г.). Бацькі жылі ў Тапалянах у былым маёнтку. Надзея закончыла рускую гімназію Паспелавай у Вільні. Там пазнаёмілася з Міколам Ільяшэвічам, маладым настаўнікам Віленскай беларускай гімназіі (выпускніком Пражскага ўніверсітэта). Ягоная нечаканая смерць 2 верасня 1934 г. перарвала трохгадовае каханне гэтых маладых людзей. Малодшы на 5 гадоў Хведар Ільяшэвіч абяцаў Надзеі ажаніцца з ёю. Слова стрымаў. Нарадзіліся ў іх дачка Марыся — у Вільні ў 1936 г., а ў Тапалянах у 1938 г. — сын Юрка. З 1937 г., калі Хведара Ільяшэвіча, быццам бы за „камунізуючы ўплыў на моладзь” выкінулі з пасады настаўніка Віленскай беларускай гімназіі, жылі ў Тапалянах. Толькі калі прыйшлі саветы ў 1939 г. пачалі займацца педагагічнай і беларускай дзейнасцю. Надзея закончыла педагагічныя курсы ў Беластоку і ўсё далейшае жыццё працавала настаўніцай. Пра яе настаўніцкую працу ў Тапалянах успамінаў у „Ніве” Канстанцін Масальскі. Думаю, што не адзін ён сярод тадышніх вучняў памятае сваю настаўніцу. Але неяк ніхто не ўспамінае.

Надзея Ільяшэвіч, пакуль у 1953 г. выехала на Вернутыя землі, працавала кіраўніком сельскагаспадарчых школ — спярша ў Беласточку, пасля ў Бухвалове каля Саколкі, а затым у Сувалках. Ёю ўсё цікавілася бяспека, дапытваючыся пра мужа: дзе той дзеўя? Калі дачка Марыся здала матуру ў 1953 г. у Саколцы, выехала ў Шчэцін. Там працавала ў Ваяводскім аддзеле Таварыства польска-савецкай дружбы і лектарам рускай мовы ў Паморскай медыцынскай акадэміі — амаль да 1970 г. Раней выехала ў Шчэцін яе сястра Вера, якая жыла там з мужам пад прыбраным прозвішчам Лаўрэньчук.

Надзея Ільяшэвіч (на здымку) памерла ў Шчэціне 11 красавіка 1974 г., так і не даведаўшыся пра лёс свайго мужа, які загінуў у аўтакатастрофе ў Нямеччыне ноччу з 6 на 7 лістапада 1948 г. Пра тое даведалася іхняя дачка толькі пасля 1980 г. Марыся дасюль успамінае, як за імі нават у Шчэціне адсочвала бяспека, выседжваючы ў іхняй хаце цэлымі днямі.

Я ўжо амаль 10 гадоў збіраю звесткі пра Хведара Ільяшэвіча і на ягонае 100-годдзе рыхтую кнігу пра яго. Сабрала вельмі багаты архіўны матэрыял. Пару гадоў таму праз пасрэдніцтва „Нівы” прасіла я адгукнуцца пра яго жыхароў Беласточчыны. Але, апрача спадарыні Алены Анішэўскай, ніхто не адазваўся. Пражываючая ў Беластоку Лідзія Л., харыстка з часоў вайны, адмовілася ад успамінаў, тлумачачыся бракам часу. Можа на гэты раз нехта яшчэ ўспомніць гэтых беларускіх інтэлігентаў даніўскіх часоў, за што я была б бязмерна ўдзячная.

Даволі дзіўныя метамарфозы адбыліся цягам апошніх дваццаці гадоў у стаўленні моладзі да народнай песні. Калі раней спевы фальклорных калектываў выклікалі з большага абыякавае стаўленне, то цяпер, наадварот, мноства маладых людзей імкнецца праяўляць свае вакальныя здольнасці менавіта праз народную песню. З таго натуральна, што наяўнасць фольк-гуртоў, у тым ліку і беларускіх, павялічваецца. З адным з іх — гуртом „Гуда” мы віртуальна пазнаёмімся гэтым разам.

Сайт ансамбля, які месціцца ў інтэрнэце па адрасе http://guda.fromby.net, выглядае неардынарна. У ім прысутнічае традыцыйнае дзяленне на тры часткі, але спосаб іх выяўлення крыху дзіўны: яны нібыта сціснутыя да левага боку. Варта адзначыць, што неардынарны дызайн прыцягвае ўвагу і таму ўзнікае жаданне пазнаёміцца з сайтам бліжэй.

Нельга сказаць, што на „гудаўскім” сайце мноства рубрык. Практычна ўсе яго старонкі прысвечаныя альбо новым запісам, альбо выступам калектыву.

Нягледзячы на тое, што сайт распавядае выключна пра „Гуду”, адразу знайсці старонку, дзе падавалася б інфармацыя пра ягонае з'яўленне, не надта лёгка. Гэтая інфармацыя не выдзеленая ні ў якую асобную рубрыку і падаецца сярод абвестак аб новых CD-дысках ці канцэртах. У самым нізе выяўлення мы можам убачыць сціплы надпіс „Больш за 10 гадоў таму...”. „Больш за 10 гадоў таму маладыя людзі (навукоўцы й студэнты) аб'ядналі свае высілкі, каб дасьледаваць старажытную гісторыю й культуру тутэйшае зямлі, — распавядаецца на сайце. — Адным з накірункаў работы стаў экспэрымэнтальны пошук у галіне архаічнае сьпеўнае спадчыны. Этнаграфічныя экспэдыцыі, у якіх адбываўся непасрэдны кантакт з жывымі носьбітамі традыцыі, работа з аўдыёй відэазапісамі, стасункі з этнамузыколягамі й фальклярыстамі дазволілі на працягу дзесяцігодзьдзя пераняць асаблівасьці старадаўняе сьпеўнае манэры”.

З віртуальнай прэзентацыі гурту становіцца зразумела, што аснову яго рэпертуару складаюць абрадавыя песні. Стваральнікі калектыву лічаць, што гэта „найбольш архаічны пласт традыцыйнае народнае культуры. Многія песьні ўжо не сустракаюцца ў жывым бытаваньні — яны ўзноўленыя паводле нотных запісаў”.

Праслухаўшы спевы „Гуды”, а гэта магчыма дзякуючы гукавым файлам на сайце, пачынаеш адчуваць нейкі подых настолькі даўніх часоў, што становіцца крыху неякавата ад прывідаў паганства і ягоных абрадаў.

Калі зазірнуць на старонку, якая прэзентуе праграму „Гуды” — „Ігры з багамі”, то здзіўленне выклікае ўжо падведзенае пад ідэалагічнае афармленне паганалюбства музыкаў. Вядома, нашы продкі калісьці верылі ў Перуна і Даждбога, але ці варта толькі паганства і скокі ля вогнішча лічыць найбольш важным набыткам старадаўняй беларускай культуры. У рэшце рэшт толькі дзякуючы адзінабожжу можна цалкавіта асэнсоўваць і аналізаваць навакольную рэчаіснасць, не бачачы ў ім адно толькі дзеянні злых ці добрых „багоў”.

Калі па сайце прасачыць дзейнасць калектыву, то яна даволі актыўная. Музыкі прымаюць удзел у розных фестывалях, праводзяць семінары, даюць майстар-класы.

Што ж тычыцца сайта, то на ім, акрамя беларускай, прысутнічаюць руская і англійская моўныя версіі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Валявы валейбол

Беларускі валейбол развіты далёка не так як у суседніх краінах — Расіі і Польшчы, фінансавае яго забеспячэнне таксама значна ніжэй сярэдняга еўрапейскага роўню. Тым большае ўражанне застаецца ад лакальных поспехаў нашых валейбалістаў, якія час ад часу здольныя даць сапраўдны бой фаварытам і скокнуць вышэй галавы. Гутарка ніжэй пойдзе найперш пра мужчынскі жлобінскі „Металург”.

Калі ў другім раўндзе еўрапейскага Кубка выкліку жлобінцы трапілі на досыць моцную польскую „Рэсовію” з горада Жэшаў, мала хто з заўзятараў, а тым больш спецыялістаў, спадзяваўся на станоўчы зыход для беларусаў гэтых паядынкаў. І не дзіва, „Рэсовія” — паўфіналіст мінулага розыгрышу гэтага кубка, а ў яе складзе выступаюць чацвёра ўдзельнікаў апошняй алімпіяды з „рэпрэзентацыі”. Але падапечныя трэнера Ігара Загорцава здзейснілі сапраўдную сенсацыю.

Гром грымнуў ужо ў першым матчы, які праходзіў у Гомелі ў прысутнасці тысячы гледачоў. Жлобінцы не проста перамаглі, але і зрабілі гэта з сухім лікам — 3:0 (25:17, 25:22, 25:21). Нават з сухога пратакола відаць, што „Металург” дамінаваў досыць выразна, прычым у другім і трэцім сеце беларусы валявымі высілкамі вырвалі канцоўкі. Але гэта была толькі палова справы. Праз тыдзень у Жэшаве палякі, здавалася б, паставілі ўсё на месца. Яны пераканаўча выйгралі тры партыі (25:14, 25:18, 25:19), пасля чаго, паводле рэгламенту, быў прызначаны дадатковы сет, які гуляецца да 15 ачкоў. І вось тут жлобінцы яшчэ раз выявілі волю да перамогі. 15:9 у „залатой” партыі на карысць беларусаў і ў наступны круг розыгрышу (1/16 фіналу) ідзе „Металург”! Брава Ігар Загорцаў!

Парадаваў і жаночы клуб з дзіўнай назвай „Атлант”, які прадстаўляе горад Баранавічы. У 1/16 фіналу Кубка ЕКВ мацнейшая каманда Беларусі, якую трэніруе Уладзімір Казлоў, адолела партугальскую „Мадэйру”. Нашы дзяўчаты ў першай гульні, што праходзіла ў гасцях, дамагліся няпростай, вырванай „на зубах” вікторыі — 3:2, а потым дома праштампавалі перамогу з такім жа агульным лікам (па ходзе справы саступаючы 0:2, а потым сур'ёзна „закасаўшы рукавы”). Сапернікам „Атланта” ў наступным раўндзе будзе турэцкі „Фенербахчэ”.

Іншая наша жаночая каманда, магілёўскі „Камунальнік”, лідар новага бягучага нацыянальнага першынства, выступае ў Кубку выкліку. У другім раўндзе розыгрышу яна сустрэлася з сафійскім ЦСКА. Матч у Балгарыі завяршыўся поспехам беларусак — 3:2, што заклала добры падмурак для агульнага поспеху. У Магілёве выхаванкі трэнера Віктара Ганчарова не далі сур'ёзных падстаў сумнявацца ў сваіх намерах. 3:1 па партыях і „Камунальнік” выходзіць у 1/16 фіналу.

Усе гэтыя поспехі дасягнуты пакуль на ранніх стадыях. Але ёсць упэўненасць, што сёлетні міжнародны сезон для беларускіх прадстаўнікоў стане больш удалым, чым папярэдні. Прыемна таксама, што ўсе тры нашы еўрадэлегаты працягваюць змаганне, што нашы каманды гуляюць амаль без легіянераў і абыходзяцца пераважна сваімі кадрамі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Расказ Веры Богуш з Трасцянкі

„Нарадзілася я на Казанскую, гэта значыць 4 лістапада 1925 года. У той час нараджалася многа дзяцей, — вярнуліся з бежанства, адбудоўвалі свае хаты і цешыліся жыццём на Радзіме. Мае бацькі Мікіта і Анна Радзіванюкі мелі паўучастка поля і абраблялі яго ўручную. Тады машын ніякіх не было. Нас, дзяцей, нарадзілася за тае Польшчы чацвёра, а наймалодшая Соня радзілася ўжо пры саветах. Усе мы з малых год працавалі з бацькамі на гаспадарцы і хадзілі ў мясцовую школу. І ўсё было добра, пакуль пасля родаў наймалодшай сястрычкі не захварэла наша мама на псіхічную хваробу. Практычна, мы, старэйшыя дзяўчаткі, глядзелі малую. І яшчэ хадзілі ў школу, у 4 і 5 класы, бо савецкі ўзровень быў вышэйшы за польскі. Як прыйшлі немцы, мы далей рабілі сваю гаспадарку. Маме было ўжо крыху лепш.

У 1943 годзе, на восень, сталі немецкія ўлады браць нас на прымусовыя работы. Завезлі нас многа ў Міхалова. Там мы яшчэ хадзілі свабодна. А потым павезлі нас самаходам у Валілы, адкуль павезлі ў Беласток у гета. Там нас трымалі за дратамі да адпраўкі ў Прусію. Мне, як і многім, з-за гэтых дратоў удалося ўцячы, бо „бежанец” гаварыў з патрулём. Мы ў той час паздымалі драты, змяшаліся з людзьмі што былі за імі і памалу адышлі. Я спачатку была ў Беластоку ў знаёмых, а пасля вярнулася дахаты. Ніхто ў вёсцы мяне не выдаў і я дажыла шчаслівa да вызвалення ў ліпені 1944 года.

Пасля вайны ў нашай сям'і зноў была бяда. Мой брат Міша наехаў на міну і некалькі тыдняў ляжаў у бальніцы ў Беластоку. Мы, сёстры і мама, хадзілі да яго пяшком, бо тады не было на чым ездзіць.

У 1945 годзе я выйшла замуж за Мішу Богуша з нашай вёскі. Выйшла ў вельмі старую хату. Але мой муж быў добры гаспадар і меў ужо з чаго будаваць сабе новую хату. І так мы будаваліся адразу на Ставоцкай вуліцы, дзе і цяпер я жыву адна. У нас нарадзілася чацвёра дзетак, з якіх выжыла трое. Адна дачушка памерла ў годзік. Засталіся Надзя, Жэнік і Галінка — яны вучыліся спярша ў сваёй школе, потым у Беластоку, там заснавалі сем'і, працуюць. На жаль, мая найстарэйшая дачка Надзя не дажыла нават да пяцідзесяці. Яе няма ў жывых ад 1995 года. Мой муж Міша памёр у 1981 годзе. Я ўжо ўдава ад 27 гадоў. Бог дае яшчэ сякое-такое здароўе, дзеці дапамагаюць як могуць, трымаю яшчэ авечак ды курэй і толькі адну зіму зімавала ў дачкі Галінкі ў горадзе. Але дома найлепш, бо тут свабода...”

Гэта столькі з расказу Веры Богуш.

Ад сябе мушу дадаць, што Вера — жанчына незвычайная. Яна дапамагае многім людзям у хваробах і ўсякіх нямоглацях. Яна адсявае сквазныя хваробы і замаўляе іх малітвамі. Да яе едуць людзі і з адлеглага наваколля.

І яшчэ адна прыкмета гэтай старэйшай жанчыны. Яна чытае малітвы пры пакойніках з Трасцянкі і не толькі. Яе забіраюць адчытваць і ў Бялкі, і ў Агароднікі. Дай Бог ёй яшчэ многа здароўя і доўгіх год жыцця!

РУТА

У сямейным крузе

Чаромхаўская раённая арганізацыя пенсіянераў і інвалідаў заснавана была на базе чыгуначных прадпрыемстваў, якія калісьці знаходзіліся ў структурах чыгуначнага вузла. У выніку членамі з'яўляюцца пенсіянеры не толькі з Чаромхаўскай гміны, але і з суседніх Кляшчэляў ды Нурца-Станцыі. Зараз гуртуюцца ў ёй таксама пенсіянеры іншых устаноў. Шматгадовым старшынёю з'яўляецца Юзаф Дубковіч.

Адна з самых актыўных арганізацый на Беласточчыне налічвае 380 членаў. Пенсіянеры ўдзельнічаюць у грамадскіх працах на карысць асяроддзя, арганізуюць культурныя мерапрыемствы ды сустрэчы старэйшын.

Дзень сеніёра ў Чаромсе адзначаўся 9 лістапада. Прысутнічала ў ім шматлікая група пенсіянераў з навакольных вёсак ды суседняй Дабрывады (Кляшчэлеўскай гміны). Зала мясцовага Асяродка культуры была набітая бітком. Навокал, пад сценамі, за багата застаўленымі сталамі заселі сеніёры. Арганізатарам мерапрыемства была Гмінная ўправа, а суарганізатарамі — Саюз польскіх пенсіянераў і інвалідаў ды Гмінны цэнтр культуры. Фінансавую падтрымку аказалі мясцовыя прафсаюзныя арганізацыі Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу. Пунктуальна а 14-й гадзіне пачалася афіцыйная частка імпрэзы. Першым голас узяў войт Міхал Врублеўскі, які прывітаў удзельнікаў сустрэчы і запрошаных гасцей, у тым ліку настаяцеля Чаромхаўскага праваслаўнага прыхода а. Георгія Пліса, старшыню Рады гміны Надзею Суліму і старшыню прафсаюзнай арганізацыі машыністаў Лявона Купрыцюка (аднаго са спонсараў). Войт пазнаёміў з рэалізацыяй важнейшых задач гміны.

— Адной з важнейшых інвестыцый мінулага года, — гаварыў войт Міхал Врублеўскі, — быў рамонт Гміннага асяродка культуры. Пакарысталіся мы як еўрасаюзнымі, так і ўласнымі сродкамі. Крэдытаў не бралі. Абышлося гэта нам сумай больш мільёна злотых. Мадэрнізавалі мы краёвую дарогу да дзяржаўнай граніцы (з дзяржаўнага бюджэту). Будуецца пагранзастава, якая будзе здадзена ў карыстанне на зломе траўня-чэрвеня 2009 г. Інвестыцыю рэалізуе Галоўная камендатура Пагранічнай аховы з уласных сродкаў, а гміна дапаможа пры абсталяванні памяшканняў. Мясцовы самаўрад не карыстаецца належным бюджэтам, таму разлічваем на еўрасаюзныя сродкі. Чакае афармлення праект мадэрнізацыі вуліц на новым пасёлку. На 111 гмін, якія прад'явілі заявы, мы знаходзімся на чацвёртым месцы. Лічым на станоўчую ацэнку, у выніку чаго ў наступным годзе зможам паклaсці асфальтавае палатно на Свярковай, Сасновай і суседніх вуліцах. Неабходная пабудова водаправода да пяці сялоцтваў: Зубач, Беразышчаў, Бабpоўкі, Пагулянкі і Апакі, але без еўрасаюзных сродкаў не зможам рэалізаваць так капіталаёмкіх інвестыцый. Тычыцца гэта і водасцёкавай каналізацыі Ставішчаў — вуліцы Вішнёвай і Кузавы. Кошт згаданай інвестыцыі — 15 мільёнаў злотых. Сёлета пачынаецца пабудова дарогі Кузава — Рэпчыцы, якая будзе рэалізавацца ў двух турах. І яшчэ дзве аптымістычныя навінкі, — заявіў прамоўца. — Першая тычыцца арэнды памяшканняў у сацыяльным будынку Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу на патрэбы Гміннага асяродка здароўя. Прадпрыемства чыгуначнай маёмасці ў Варшаве абавязалася паменшыць арэндную стаўку для ЗОЗ у Гайнаўцы напалову, што паўплывае на паніжэнне коштаў публічнай службы здароўя. Другая тычыцца разбудовы пагранперахода Полаўцы — Пяшчатка, — завяршыў выступленне войт Міхал Врублеўскі.

Чарговы прамоўца — старшыня Юзаф Дубковіч назваў прозвішчы ўзнагароджаных ганаровымі граматамі з нагоды юбілею 80-годдзя з дня нараджэння і новапрынятых членаў. Пасля цырымоніі ўручэння грамат і членскіх білетаў прысутныя згаварылі малітву, а а. Георгій Пліс пажадаў „прыятнага апетыта”. Варта адзначыць, што падрыхтоўкай смакавітых бутэрбродаў, салодкасцей, пячэння і ўсялякага віду напіткаў займаліся працаўнікі Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі. Душу весялілі мясцовыя музыканты. Яны падыгрывалі да танца, не ляніўшыся. Атмасфера была свойская, сяброўская, як павінна быць у дружнай сям'і. У зале царылі музыка і спевы, а пад гукі гармоніка кружыліся пары.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

1. падзагаловак кнігі, якая змяшчае падборку выбраных твораў, 2. не вада, разліці шкада, 3. сталіца Каба-Вердэ (Астравоў Зялёнага Мыса), 4. дакумент, у якім зведзены акрэсленыя даныя, 5. квадратны корань з чатырох, 6. імя Цэзара, ад якога пайшла назва аднаго з календароў, 7. падоўжаная скрыначка для ручак, алоўкаў, гумак, 8. ежа, 9. плод яблыні, 10. загадзя намечаная сістэма мерапрыемстваў, якая прадугледжвае парадак, паслядоўнасць і тэрмін выканання работ, 11. птушыны „нос”, 12. назва ніжняга цячэння ракі Путумаё, па якой праходзіць граніца паміж Калумбіяй і Пэру, 13. кітайска-казахская рака, якая ўпадае ў возера Балхаш, 14. сяброўка яблыка ў выглядзе акруглага конуса, 15. мястэчка на Сакольшчыне, якое з пачаткам 2009 года стане горадам, 16. сталіца Францыі, 17. фруктовае дрэва (анаграм назвы галоўнай польскай ракі).

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — шведская прыказка.

(ш)

		1			2	3		4				
5		6				7						
		8								9	10	
11					12						13	14
					15			16				
								17				

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 42 нумара

Воўк, гаворка, Дунай, лея, права, прыгон, хакі, цела, Чэ, яма.

Рашэнне: **Мяркуй пра чалавека паводле ацэнкі ягоных ворагаў.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 660 egz.

Дырэкцыйны парк у Белавежы

Пётр БАЙКО

Праектуючы ў 1890 годзе Палацавы парк у Белавежы, Валеры Кроненберг, вядомы польскі агароднік-планавік, быццам для прасторавай раўнавагі, апрацаваў таксама праект крыху меншага парку, які змясціў на супрацьлеглым канцы Белавежскай паляны. Заснаваны на зломе XIX і XX стагоддзяў, парк гэты спачатку быў названы „палкавым". Як сама назва паказвае, меў ён выконваць ролю акружэння для палка войска, якое часова размяшчалася ў Белавежы. Цяперашняя назва парку ўзнікла ў міжваенны перыяд — ад месцазнаходжання тут Дырэкцыі дзяржаўных лясоў.

Дырэкцыйны парк быў заснаваны на плошчы каля 20 гектараў, у форме набліжанай да прамавугольніка. У 1935 годзе ён быў нязначна пашыраны, а ў шасцідзесятых і сямідзесятых гадах XX стагоддзя — перапраектаваны. Першапачаткова парк быў акружаны жывой яловай агароджай, ровам і плотам з калючага дроту. Больш-менш у яго цэнтральнай частцы быў збудаваны пышны, двухпаверхавы будынак, прызначаны для Праўлення Белавежскай пушчы. Не зберагліся дакументы з інфармацыяй, у якім годзе закончылася пабудова гэтага аб'екта. Праўда, у адной з распрацовак Дзяржаўных лясоў указваецца год 1912, але існуюць прадпасылкі, якія дазваляюць адсунуць гэты факт да злому XIX і XX стагоддзяў.

Праўленне Белавежскай пушчы размяшчалася на першым паверсе, на другім жыў начальнік праўлення. Сумесна з пабудовай будынка, на тэрыторыі парку збудаваных было таксама 7 драўляных жылых дамоў для чыноўнікаў праўлення. Пры кожным з іх узведзены былі гаспадарчыя будынкі, а побач — размешчаны садзікі. У 1913 годзе ў будынку праўлення арганізаваўся прыродазнаўча-паляўнічы музей. У жніўні 1915 года экспанаты музея былі вывезены ў Маскву, адкуль у Белавежу ўжо не вярнуліся.

Падчас I сусветнай вайны ў будынку праўлення ўладкаваўся нямецкі палявы шпіталь. У гэты перыяд ад паўночнага боку будынка заснаваны быў вайсковы могільнік у форме прамавугольніка, абгароджаны мурком. На крыжах віселі таблічкі з прозвішчамі памерлых, датай смерці і назвай атрада. Астанкі гэтага могільніка пратрымаліся да сямідзесятых гадоў; апошнія надмагільныя пліты былі скарыстаны адным жыхаром з наваколля пры закладцы фундамента пад жылы дом. У 2002 годзе могільнік быў адбудаваны ў сімвалічным выглядзе і ў трохі іншым месцы.

Пасля вызвалення, у снежні 1920 года, у будынак былога Праўлення Белавежскай пушчы перасялілася з Брэста Акружное праўленне Дзяржаўных лясоў, якое потым (з 1925 года аж па верасень 1939 года) функцыянавала як Дырэкцыя дзяржаўных лясоў у Белавежы. У гэты перыяд была гэта самая вялікая ўстанова ў Белавежы. Ахоплівала яна 35 надлясніцтваў на тэрыторыі Беластоцкага, Палескага і Навагрудскага ваяводстваў. У памяшканні ДДЛ сваю прыстань знайшлі таксама шматлікія грамадскія арганізацыі.

На пачатку дваццатых гадоў, на паляне перад будынкам ДДЛ, адкрылася метэаралагічная станцыя, якую ў 1926 годзе перавялі ў Палацавы парк. Станцыя падначальвалася Броўскаму надлясніцтву, якога канцылярыя ўжо з 1919 года змяшчалася ў адным з чыноўніцкіх будынкаў, у паўднёвай частцы парку.

У 1927 годзе, на паўднёвай мяжы Дырэкцыйнага парку, распачалася пабудова рымска-каталіцкага касцёла св. Тэрэзы ад Дзіцятка Езус. Касцёл асвечаны ў 1934 годзе. На год раней закончыліся працы на будове плябаніі, якая знаходзіцца непадалёку касцёла.

Будынак даўняга Праўлення Белавежскай пушчы, а зараз Установы натуральных лясоў ДІЛ

Дырэкцыйны парк спачатку падпарадкаваны быў Надлясніцтву Рэзерват. Потым, у 1930 годзе, перадалі яго Белавежскаму надлясніцтву, у якога распараджэнні застаецца да сённяшняга дня.

У 1935 годзе на тэрыторыі Дырэкцыйнага парку здадзены былі ў карыстанне тры тэнісныя корты, якія належалі Дапрызыўной падрыхтоўцы леснікоў. У трыццатыя гады ў парку праводзіліся спартыўна-вайсковыя спаборніцтвы ў яздзе верхам на конях і малакаліберная стральбе. Адбываліся тут таксама рознага роду мерапрыемствы — адпаведныя акалічнасці або забаўляльныя.

З 1935 года ў парку дзейнічалі крама і бібліятэка „Сям'і лесніка".

У 1937 годзе здадзены быў у карыстанне будынак школьнай бурсы, які стаяў пасуседску з будынкам ДДЛ (ад паўднёвага боку). Бурса магла прыняць 100 дзяцей. Вёў яе мясцовы Аддзел „Сям'і лесніка". У летні перыяд арганізаваліся тут абучальныя курсы для лясных працаўнікоў. Падчас савецкай акупацыі ў бурсе змяшчалася дзесяцігодка, а падчас нямецкай — знаходзіўся ў ёй пост жандармерыі, а таксама атрад дапаможнай паліцыі (Hilfspolizei). Пасля вайны ў будынку некалькі год дзейнічаў Дзяржаўны лясны навучальны асяродак, затым — у 1951 годзе — уладкаваўся ў ім Лясны тэхнікум, займаючы будыніну да часу перадачы ў карыстанне ў верасні 1969 года новага школьнага гмаху. У вызваленых памяшканнях старой школы на працягу некалькіх гадоў змяшчаўся інтэрнат тэхнікума. Затым будынак быў разабраны, а на яго месцы ў 1974 годзе распачалася будова вялікага інтэрната для вучняў Лясного тэхнікума. Здадзены быў ён у карыстанне ў снежні 1977 года. Да 1979 года пры інтэрнаце ўзнікла спартыўная пляцоўка для малых гульняў, цяпліца, ачышчальня сцёкаў і школьныя майстэрні.

Пасля вайны, у 1951 годзе, у будынку царскага Праўлення Белавежскай пушчы ўладкаваўся Раён дзяржаўных лясоў. Частку памяшканняў у гмаху заняў інтэрнат Лясного тэхнікума. У 1957 годзе Раён дзяржаўных лясоў перасяліўся ў Егерскі дом, што размясціўся ля ўсходняй мяжы Палацавага парку ў Белавежы. Інтэрнат займеў тады ўвесь будынак і функцыянаваў у ім да часу збудавання новага, свайго будынка. У частцы вызваленых памяшканняў на некалькі год уладзілася бібліятэка тэхнікума, затым гмах гэты ў 1990 годзе заняла Установа аховы прыроды (зараз — Установа натуральных лясоў) Даследчага інстытута лясніцтва, якая дагэтуль змяшчалася ў Маршальскім доме на тэрыторыі Палацавага парку.

У пяцідзесятых гадах, у паўночна-заходняй частцы Дырэкцыйнага парку, на месцы даўнейшых гаспадарчых будынкаў, узнікла футбольная пляцоўка.

Новы будынак Лясного тэхнікума будаваўся ў 1964-1968 гадах. Змяшчае ён 24 класы-майстэрні, гімнастычную залу, памяшканні для адміністрацыі і настаўніцкія кабінеты. У той самы час, у паўднёвай частцы парку, узведзены былі два чатырохсямейныя жылыя дамы для настаўнікаў, кацельня цэнтральнага ацяплення, выканана было асвятленне дарожак, пад'язных дарог і школьных аб'ектаў, якія адначасова былі агароджаны. У 1971 годзе, побач двух настаўніцкіх будынкаў, збудаваны быў трэці.

Пасля здачы ў карыстанне новага гмаху Лясного тэхнікума, вакол яго ў 1970-1971 гадах пасаджана каля 2000 штук дрэў і кустоў, якіх прывезлі з Кракава. Заснаваны быў таксама батанічны садок, затым альпінарый. У 1988 годзе садок і альпінарый налічвалі 700 відаў раслін, што выступаюць так у Белавежскай пушчы, як і ў іншых геаграфічных рэгіёнах.

У лістападзе 1972 года гарцэры з Лясного тэхнікума закончылі працы на будове тэніснага корта ля школы.

У 1976 годзе Бюро даследавання і дакументацыі помнікаў старадаўнасці ў Беластоку выканала падрабязнае апісанне Дырэкцыйнага парку, інвентарызуючы адначасова выступаючыя на яго тэрыторыі дрэвы (65 відаў і тыпаў) і кусты (33 віды). Амэлія Кавецкая ў сваю чаргу ў 2000 годзе зрабіла падрабязную інвентарызацыю паркавых дрэў. Ідэнтыфікавала яна на грунце і абазначыла 970 дрэў памерамі звыш 10 сантыметраў на вышыні 1,30 метра ад зямлі. Абазначаныя дрэвы прадстаўляюць 52 віды і іх разнавіднасці.

У 1987 годзе ў паўднёва-заходняй частцы Дырэкцыйнага парку завяршылася пабудова двух чатырохсямейных двухпаверхавых жылых дамоў, прызначаных для настаўнікаў тэхнікума.

18 снежня 1986 года Ваяводскі захавальнік помнікаў старадаўнасці ў Беластоку занёс Дырэкцыйны парк у спісак помнікаў старадаўнасці. 29 снежня 1986 года на гэтым жа спіску апынулася 7 даўніх жылых чыноўніцкіх дамоў.

Мінаючы, 2008 год таксама ўпісаўся ў гісторыю парку новымі падзеямі. Вось, у верасні на пляцы перад школай адкрыта была мемарыяльная дошка ў гонар інж. Тадэвуша Макшыцкага (1926-2007) — шматгадовага і заслужанага дырэктара гэтай школы, а таксама яе настаўніка і выхавацеля моладзі. Дырэктар Макшыцкі пабудаваў новую школу, інтэрнат і спадарожныя ім будынкі. Па ініцыятыве Беластоцкага аддзела Саюза пілсудчыкаў у Беластоку, побач будынка царскага праўлення пушчы пастаўлены невялікі помнік маршалу Юзафу Пілсудскаму. Адкрыццё помніка прадбачваецца на 28 лістапада.

23.11 — 29.11

(22.03. — 20.04.) Зрэалізуеш свае намеры і планы і не толькі ты гэта палічыш каштоўным. Чакаюць цябе таксама поспехі ў кампаніі. З 23 да 27.11. не пазбегнеш усё ж дробных расчараванняў, якіх раней ты не прымаў пад увагу. На працы не ўсе будуць табе спрыяць. Не рабі нічога сілай.

(21.04. — 21.05.) Адкрыюцца перад табою новыя магчымасці, прытым перш за ўсё ў справах, якія ты лічыў ужо безнадзейнымі. Найбольшыя поспехі — дзякуючы цярплівасці, памяркоўнасці і шчасцю. Затое могуць адазвацца суставы ці нявылечаныя зубы!

(22.05. — 22.06.) 25-29.11. могуць выявіцца непаладкі з хатнімі. Хтось спрабуе перасварыць цябе з блізкімі! Гэты тыдзень пастарайся аддаць падарожжам, адпачынку — ты таго сапраўды варты! Блізняты, якія пачалі працаваць, — на добрай дарозе да незалежнасці.

(23.06. — 23.07.) Да 26.11. не чакай зашмат ад людзей, якія чым больш гавораць, тым менш з гэтага вынікае. Пазбягай падарожжаў і афармляння важных спраў, асабліва прафесійных; непаразуменні, лёгкадумнасць, праблемы з камунікацыяй. І падыдзі ўрэшце да спецыяліста, да якога выбіраешся як на заўтра!

(24.07. — 23.08.) Многа аптымізму, радасці, энтузіязму. У фінансах канец застою. Інвестуй, карыстаючыся вопытам сям'і. У каханні дрыжыкі эмоцый.

(24.08. — 23.09.) Клопаты ў сям'і, праблемы з хатнім абсталяваннем і прыладамі ці аўто. Магчыма, што прыйдзецца адмовіцца ад падарожжа. Раскусіш сваіх праціўнікаў, будзеш свабодны, з проста неабмежаванымі магчымасцямі. Самотнай Дзеве можа бліснуць прамень надзеі.

(24.09. — 23.10.) Шматабяцальныя дні! Ажыўленне, гарачыя падзеі, рух у інтарэсах, мілая атмасфера на працы. Чытаючы між радкоў, хутчэй наладзіш кантакт з асобай, якая не гаворыць чагосьці проста ў вочы. Скантралюй горла (асабліва калі курыш), зубы і ціск крыві.

(24.10. — 22.11.) Вялікія перамены ў духовым жыцці, моц зрэалізаваць змены. Працяг магчымасці фінансавага піку. Тым больш што ты крыху зможаш пакруціцца пры сваіх справах. Могуць вярнуцца грошы. Ворагам у каханні можа аказацца твая запальчывасць і ахвота кінуць усё на шалі.

(23.11. — 22.12.) Усё, за што бярэшся, ідзе спраўна і без перабояў. Агляніся — наўкола шмат магчымасцей, за якія можаш паспяхова ўхапіцца. Асаблівы дар прыцягвання ўвагі, сімпатыі, прыхільнасці. Хтосьці, каму ты вельмі імпануеш, чакае твайго першага кроку.

(23.12. — 20.01.) Будзеш больш сардэчны, даступны для іншых. Асаблівае шчасце да людзей, нагоды на цікавыя знаёмствы. Станеш перад жыццёвым выклікам, неабходнасцю закрыцця папярэдняга раздзела ў жыцці.

(21.01. — 19.02.) Процьма нагод для цікавых сустрэч, таксама і любоўных. Самотнага Вадалея зацікавіць хтосьці пякельна інтэлігентны. Паправяцца адносіны са сваякамі, імпрэзы цудоўныя, госці фантастычныя, шчасце ў падарожжы.

(20.02. — 21.03.) Не сядзі ў куце — там цябе не знойдуць. Амбітным Рыбам гарантаваны поспех. Прэзентуйся свету, шукай вядомасці, смела выходзь з праектамі; калі не хапае ведаў для гэтага — падвучыся. Файныя размовы да белага рання.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960